

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

СТУДЭНТЫ ☞ 8

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 17 (2606) Год LI | Беласток, 23 красавіка 2006 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Тужу па беларускай мове

Размова з Тамашом САЕВІЧАМ — карэспандэнтам Польскага радыё ў Пекіне.

— ***Твая апошняя тэма?***

— Раскажу пра дзве, таму што якраз абедзве ўзаемна папаўняюць сябе і ў пэўным сэнсе паказваюць шырокі вобраз Кітая. За славутым Пляцам Цьянаньмынь знаходзіцца квартал самых старых шоўкавых крамаў. Малыя, прыгожыя вулачкі. Чырвоныя лампіёны. Дамы яшчэ з XIX стагоддзя — традыцыйная кітайская архітэктура, перамешаная з каланіяльным стылем. У тым ліку там і знаходзіцца самая старая шоўкавая крама ў Пекіне, якая працуе з 1830 года. Адным словам — турыстычны кайф, таму што там усё сапраўднае. Зразумела, умовы на гэтых вулачках нагадваюць арабскія базарныя кварталы ў Іерусаліме ці Багдадзе. Але гэта сапраўднае жыццё. І гэты квартал будзе існаваць недзе да канца красавіка, таму што яго разбураюць (дык гэта ж цэнтральнае месца сталічнага Пекіна!), і пэўна пабудуюць там нейкія гатэлі і небаскробы... І другая тэма — у Пекіне нядаўна адчынены быў першы салон продажу славутых амерыканскіх матацыклаў „Гарлей-Давідсан" і якраз у гэты дзень з першым канцэртам у Кітаі выступіў гурт „Роллінг Стоўнз". І тут цікавінка — цягам гадоў музыка „стоўнзаў" была ў Кітаі забаронена. Калі дазволілі канцэрт, аказалася, што зацікаўленне ім кітайцаў мінімальнае.

— ***Ці сустрэўся Ты ў Кітаі з праваслаўем?***

— Так. Маю знаёмых расіян, сербаў, а нават адну беларускую сям'ю. Гэта сутыкненні з людзьмі. На тэрыторыі расійскага пасольства ў Пекіне знаходзяцца будынкі, якія калісьці прыналежылі да праваслаўнай місіі ў Кітаі. Аднак здаўна, па прычыне як цяперашняй сістэмы ў Кітаі, так і ранейшай у Савецкім Саюзе, яны з'яўляюцца толькі часткай пасольства. Раз на нейкі час у Пекін прылятае праваслаўны святар з Ганконга. Паколькі ведаю, пытанне пабудовы праваслаўнага храма ў Пекіне (а такі ёсць у Шанхаі) было адной з тэм нефармальных перамоў расійскага прэзідэнта Пуціна ў час яго візіту ў Кітай. Вядома, што для кітайскіх улад рэлігійныя тэмы вельмі далікатныя, але Кітай мяняецца, а ў Пекіне жыве ўсё больш праваслаўных. Думаю, што гэта толькі пытанне часу, калі першая праваслаўная царква нанава адчыніцца ў сталіцы Кітая.

— ***Ці ёсць кітайскі адпаведнік хрысціянскага Вялікадня? Калі ён выпадае і як яго адзначаюць?***

— На жаль, зусім няма, кітайскі і хрысціянскі календары цалкам не супадаюць і няма гэтага нават як параўноўваць. На гэтае пытанне знаёмы кітаец адказаў: „Няма ў нас такога свята, дык гэта ж Кітай!"

— ***Ці пра рэлігійныя святы гаворыцца ў публічных медыях?***

— Разам з тым як Кітай адчыніўся на свет, адчыніўся таксама і на іншаземцаў. Нагадаю, што ў Кітаі ў мінулым годзе пастаянна працаўладкаваных было 150 000 іншаземцаў і гэтая колькасць з 2004 года павялічылася ўдвая! І, адказваючы — так, гаворка вядзецца ў кантэксце іншаземцаў. Для мяне амаль шокам было, што хрысціянскае Божае Нараджэнне ў Кітаі з'яўляецца камерцыйным святам. Кітайцы не маюць нічога падобнага накшталт Раждаства, але, нягледзячы на тое, купляюць сабе падаркі, ёлкі і гэтак далей. Але большасць з іх Божае Нараджэнне асэнсоўвае так як Дзень Святога Валянціна ці амерыканскі „Галёўін". Проста, кітайцы ў вялікіх гарадах „вестэрнізуюцца". Мушу сказаць, што ад лістапада да паловы студзеня найбольш мяне выводзілі з раўнавагі калядкі, якія ў маім супермаркеце спявалі перапранутыя за Дзеда Мароза кітаянкі і заахвочвалі купляць падарункі.

— ***Ці працуеш з дапамогай кітайскага асістэнта? Наогул на якой мове там кантактуеш? Ці маеш прыватныя кантакты з кітайскімі журналістамі? Знаёмых?***

— Зразумела, „кітайскія" тэмы рэалізую з дапамогай перакладчыка. Хаця таксама інтэнсіўна вывучаю кітайскую мову, таму што гэта дапамагае мне ў штодзённым жыцці. Мушу сказаць, што пасля нейкага часу можна навучыцца кантактавацца па-кітайску і гэта не такое страшнае як нам здаецца; прынамсі мне здавалася гэта немагчымым. Зразумела, журналісцкі свет цесны і пастаянна маю кантакт і з кітайскімі, але перш за ўсё з замежнымі журналістамі. Знаёмых многа. І што мне найбольш падабаецца — мае самыя блізкія знаёмыя, апрача палякаў і расіян, гэта венесуэльцы, аўстралійцы, нідэрландцы, англічане. І за гэта люблю Кітай, што ў Пекі-

[працяг ☞ 3]

Са Святамі!

Гадавіна Чарнобыля ☞ 2

Уладзімір Хільмановіч

Добра памятаю той спякотны дзень, калі сонца паліла неяк незвычайна. У нашай вайсковай частцы якраз праводзіліся спартовыя спаборніцтвы. Чуткі пра катастрофу дайшлі хутка, гаварылі пра Украіну і спачатку пра горад Цярнопаль. Праўда стала даходзіць пазней, вельмі дазавана. Праўду, як звыкла, хавалі. Можа таму Чарнобыль і не стаў нашай Хірасімай...

Неўязныя ☞ 2

Мацей Халадоўскі

Савет Еўрасаюза зацвердзіў урэшце спісак „беларускіх чыноўнікаў, адказных за ўдзел у фальшаванні прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі, якіх ахапіла адмова ўезду на тэрыторыю ЕС". Адкрывае яе, вядома, прэзідэнт — А. Л. Апынуліся там найвышэйшыя рангам чыноўнікі. Няма затое віноўнікаў непасрэднага кантакту...

Абмен вопытам ☞ 4

Аляксей Мароз

Дэпутаты мясцовых саветаў і выкладчыкі вышэйшых навучальных устаноў Беларусі, якія з 2 па 8 красавіка прымалі ўдзел у праекце „Блізкае самакіраванне. Беларусь і польскі досвед", наведалі самаўрадавыя ўстановы Беластока, Бельска-Падляшскага, Гайнаўкі і Чыжоў. Пазнаёміліся яны з новымі досведамі і хочуць распрацоўваць новыя праекты наконт сістэмы самакіравання ў Беларусі...

У Дубне ☞ 5

Аляксандр Вярбіцкі

На фоне іншых вёсак нашай Усходняй сцяны Дубна выглядае даволі прыстойна. Старыя хаты ёсць, але яны перспектыўныя: яшчэ зіма не забрала сваёй белай вопраткі для абнаўлення, а ўжо гаспадары старых дамоў выйшлі прыхарошыць іх для прыёму вясны. Значыць, у Дубне хаты не будуць пуставаць...

Чарнабельская рэспубліка

Дваццатыя ўгодкі чарнобыльскай катастрофы не будуць адзначаныя на беларускім дзяржаўным роўні як агульнанацыянальная трагедыя. За гэтыя два дзесяцігоддзі, пасля адной з самых жудасных катастроф у гісторыі чалавецтва, Беларусь як краіна па вялікаму рахунку застаецца савецкай рэспублікай. Як мудрагеліста граюць у нашым краі колеры! У 1918-1919 годзе на тэрыторыі колішняга Бабруйскага павета зусім кароткі час існавала так званая Рудабельская рэспубліка. Ну, а злавеснае спалучэнне чорнага і зямлі пад белымі крыламі прывяло да стварэння асаблівай Чарнабельскай рэспублікі. Наўпрост ці ўскосна тая страшная аварыя ўплывае і яшчэ доўга будзе адбівацца на лёсе ўсіх беларусаў — ад Бялынічаў да Бельска.

Добра памятаю той спякотны дзень, калі сонца паліла неяк незвычайна. У нашай вайсковай частцы якраз праводзіліся спартовыя спаборніцтвы. Чуткі пра катастрофу дайшлі хутка, гаварылі пра Украіну і спачатку пра горад Цярнопаль. Праўда стала даходзіць пазней, вельмі дазавана. Праўду, як звыкла, хавалі. Можа таму Чарнобыль і не стаў нашай Хірасімай, па вялікаму рахунку не страсянуў і не схамянуў нацыю. І гэта не віна беларускага народа, а яго вялікая бяда, бо ніхто не ведае сапраўдных маштабаў і пагібельных наступстваў катастрофы. Ад людзей, як і дваццаць год таму, дагэтуль хаваюць сапраўдны стан рэчаў. І зноў з Масквы і Мінска гучыць хлуслівая рыторыка пра рэанімацыю „великой страны". А на забруджаныя тэрыторыі робяцца паказушныя „рабочие поездки" і дэкларуецца, што там можна жыць, не баючыся за здароўе.

У 1986 годзе Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Беларусі, які кіраваў Беларуссю, па загадзе Масквы тыдзень трымаў у таямніцы маштабы і сутнасць смяротнага ядзернага выбуху. Зразумела, што аніякіх захадаў па ратаванні людзей не рабілася. Больш таго, камуністычная бээсэсэраўская наменклатура загадала людзям браць удзел у першамайскіх дэманстрацыях-шэсцях, хоць ужо было вядома наколькі небяспечна быць на вуліцах у тыя спякотныя дні. Процьма людзей папала пад прамое выпраменьванне, хоць гэтага можна было і ўнікнуць. Ужо толькі за гэта кожны нармальны чалавек мусіць ненавідзець такую пачварную краіну як СССР. Бо ў той краіне ўсе гаспадарчыя заваёвы і дасягненні, усе вайсковыя „великие победы" дасягаліся заўсёды коштам жыццяў незлічоных ахвяр.

Тысячы беларускіх вайскоўцаў — шэрагоўцаў і афіцэраў малодшых рангаў былі кінутыя на ліквідацыю наступстваў чарнобыльскай аварыі. Лішне казаць, як гэта адбілася на іх жыцці і здароўі. Колькасць памерлых ад радыяцыйнага выпраменьвання невядомая, такой статыстыкі папросту ці няма, ці яна моцна засакрэчана. Ахвяр Чарнобыля намнога больш, чым колькасць жыхароў раёнаў, якія былі забруджаны радыяцыяй адразу пасля выбуху (70 адсоткаў выкідаў адразу выпалі на беларускую зямлю). Дакладна вядома, што некалькі радыеактыўных аблокаў, па загадзе Крамля, былі пры выкарыстанні авіятэхнікі „пасаджаныя" на беларускую тэрыторыю. Заўважце, ключавыя праявы „братэрскай любові" далей Масква будзе выяўляць з цыклічнасцю.

Роўна праз 10 гадоў, у сакавіку-красавіку 1996 года ў Мінску адбыліся маштабныя народныя дэманстрацыі. На ўгодкі БНР на вуліцы сталіцы выйшла 30 тысяч чалавек, якія пратэставалі супраць аб'яднання Беларусі з Расіяй. 2 красавіка зноў прайшло масавае шэсце супраціву падпісанню Лукашэнкам дамовы з Масквой пра ўтварэнне так званай „Супольнасці Расіі і Беларусі". А 26 красавіка адбыўся вялікі 50-тысячны мітынг апазіцыі. Улады тады кінулі на задушэнне „Чарнобыльскага шляху" атрады адмысловага прызначэння, вайсковыя падраздзяленні, запрошаныя расійскія аддзелы ОМОН. На вуліцах адбыліся жорсткія сутычкі, шмат людзей было паранена, арыштавана болей за 200 чалавек. Далей была вядомая спроба імпічменту прэзідэнту і ратаванне яго Масквой.

Мінула яшчэ 10 гадоў, нібы завяршыўся колаабарот і зноў у сталіцы Беларусі выспелі падзеі. Зноў моцная хваля народнага пратэсту, зноў хісткасць рэжыму, зноў тыя самыя ці такія самыя эмісары-ратаўнікі з Усходу. Але сёлетні „Чарнобыльскі шлях" мае шанцы стаць больш знакавым, больш паказальным і вызначальным. А чарнобыльская бяда — гэта найперш не экалагічная, не гаспадарчая і не дэмаграфічная праблема. Гэта праблема мела і мае перш за ўсё палітычны характар, які вызначае ўсё іншае. І будзем верыць у прарочыя словы нашага паэта пра Беларусь — „У віхры дзікім не загінеш, Чарнобылем не зарасцеш".

Уладзімір Хільмановіч

Валы з тэлефонамі

Прыязджае да цябе кур'ер і заяўляе, што мае для цябе пасылку з накладной паштовай платай. Кошт каля 500 злотых. На пасылцы — тваё прозвішча, імя і правільна напісаны адрас. Прыслала яе фірма „X", якую ты не ведаеш і нічога ў ёй не заказваў. Кур'ер заяўляе, што яму на гэту тэму нічога невядома, яго заданне — занесці пасылку і прыняць грошы, але, калі ёсць нейкія сумненні — трэба іх „ад рукі" высвятліць, па тэлефоне.

Кур'ер пытаецца, ці можа пазваніць ад цябе ў фірму і хутка ўсё будзе ясна... 99% людзей, не падазраваючы нічога, пускае кур'ера ў хату, паказвае, дзе стаіць тэлефон, бо хоча хутка высветліць памылку. Кур'ер выконвае КАРОТКІ ТЭЛЕФОН (1 хвіліна) і быццам правярае ў фірме, ці няма памылкі, пасля інфармуе, што фактычна гэта здарылася, ветліва просіць прабачэння і выходзіць! (Казкі пра памылкі розныя, у залежнасці ад рэакцыі таго, каго падпускаюць)

Праз месяц прыходзіць рахунак на каля... 10 000 долараў. Нявінны „кароткі тэлефонік" абляцеў за той час увесь свет праз камерцыйныя перакіраванні (Сейшэльскія астравы, Балі, Кайманы і шмат іншых, каб трапіць урэшце на sexline ў Аўстраліі).

Як гэта было магчыма? Ты ж глядзеў кур'еру на рукі, відаць было, што набірае ён нумар стацыянарнага тэлефона. А той нумар — у апараце нанятай (паціху, у дадатак на „левыя" паперы) кватэры, у якой стаіць невялічкая прылада, якая адразу перакіроўвае „тваю" размову. Ці маеш шанц на рэкламацыю ў TP S.A.? Не маеш, бо званілі з твайго тэлефона, значыць, пры тваёй згодзе.

Звоніць табе чалавек і заяўляе, што ён — працаўнік Польскай тэлекамунікацыі. Інфармуе, што якраз памянялі табе кабельную скрынку ці нейкую іншую прыладу. У сувязі з гэтым манцёры TP S.A. тэстуюць спалучэнні і просяць пацвердзіць правільнасць функцыянавання, націскаючы клавішы: 9,9#, 09, 09#, 90, 90#. ***Не націскай і нічога не пацвярджай!*** *Калі гэта зробіш, адразу цябе перакіруюць на sexline (вядома, на твой кошт) у Вялікабрытанію праз паўсвету, праз Ціхі акіян (праз востраў Ніуа!), і калі нават адразу кінеш трубку, нічога гэта не дасць — спалучэнне працягваецца да канца 5 хвілін. А каштуе тая прыемнасць 1 500 злотых.*

Калі хтосьці пазваніць табе і скажа, што ты штосьці выйграў, кідай трубку, нічога не націскай! Ніякіх лічбаў, зорачак, крыжыкаў. Калі пазваніць табе любы незнаёмец! — няважна, фірма, ці прыватная асоба — і папросіць адзваніць ім праз нейкі час, можа гэта каштаваць цябе 320 зл. за само спалучэнне! Ашуканцы падшываюцца часта пад рознага віду ўстановы ці секцыі жыллёвых кааператываў. Установа будзе мець да цябе справу — вышле табе ліст.

Калі пазваніць табе хтосьці з інфармацыяй, што выйграў ты нейкую ўзнагароду (пераважна эксклюзіўную экскурсію) і ў дадатак папросіць націснуць клавіш 9, каб пацвердзіць інфармацыю, і калі гэта зробіш, ты ўжо падстаўлены на „цацы". Спалучэнне з гэтай лініяй каштуе 20 фунтаў за хвіліну (размова перакіравана праз Кайманскія астравы на sexline ў Англіі). Калі нават кінеш трубку, зашмат гэта не дасць, бо спалучэнне працягваецца 5 хвілін. А калі яшчэ лепш — падасі ім і свае даныя! — то праз дзве хвіліны даведаешся, што сапраўды ты не выйграў. Ды заплаціш 260 фунтаў. Можа пазваніць таксама хтосьці, хто прыкідваецца тэхнікам TP S.A., папросіць націснуць клавіш 9, і вынік будзе такі самы. Праблема датычыць таксама ***мабільных тэлефонаў. Ніколі не націскай 9,0,# або 9,0# у гэтых камбінацыях****. Нумар, з якога табе звоняць, гэта пераважна: 07090203840. Нумар можа адрозніваццa 4 апошнімі лічбамі. Паяўляецца спачатку як непрыняты. Не адзвоньвай на гэты нумар — каштуе гэта 320 зл. за хвіліну (sexline ў Аўстраліі).*

Што рабіць? *Нічога не рабіць на „ўра". Нічога не націскаць і нічога не пацвярджаць. Пазваніць свайму аператару, напр. TP S.A.(9393) і прабаваць заблакаваць усе камерцыйныя нумары: 0-700..., 0-300..., 0-400... як і магчымасці перакіроўванняў на іх. Заблакаваць усе міжгарадскія, міжнародныя і мабільныя нумары — кожны аператар мае абавязак падаць табе код, які актывуе такія спалучэнні і другі код, які іх дэзактывуе. Атрымаеш ад аператара два асабістыя логіны і нікому іх не паказвай. Запішы дату і час спалучэння з аператарам з гэтай нагоды, запішы імя і прозвішча асобы, якая прымае тваю заяву, папрасі пісьмовае пасведчанне факту рэалізацыі заявы. Калі будзеш мець усё на паперы, дык, калі б што, выйграеш у кожным судзе.*

Міраслава Лукша

Вачыма еўрапейца

Спісак

Ну і ёсць ужо спісак — канчатковы. Гэта спісак: 30 + 1 + 6. Спісак Еўрапейскага Савета. Спісак Еўрасаюза. Спісак міністраў Еўрасаюза. Спісак...

Але, ad rem. Савет Еўрасаюза зацвердзіў урэшце спісак „беларускіх чыноўнікаў, адказных за ўдзел у фальшаванні прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі, якіх ахапіла адмова ўезду на тэрыторыю ЕС". Адкрывае яе, вядома, прэзідэнт — А. Л. Апынуліся там найвышэйшыя рангам чыноўнікі. Няма затое віноўнікаў непасрэднага кантакту. Размаўляў я з Багданам Кліхам з Калектыву па справах Беларусі ў Еўрапарламенце:

— Маю мяшаныя ўражанні. З аднаго боку, цешуся, што зрэагавалі на нашы пастулаты [Польшчы, Славакіі, Літвы — М. Х.]. З другога боку, шкада, што так позна. Я падаў пастулат у гэтай справе ў кастрычніку 2004 г. Мусіла мінуць паўтара года. У такім тэмпе ЕС нельга дзейнічаць.

І падкрэсліў:

— Гэты спісак — 30 плюс адзін, гэта значна менш таго, чаго мы чакалі. Павінны быць на ім таксама прадстаўнікі адміністрацыі мясцовага, рэгіянальнага ўзроўню, якія аднолькава небяспечныя, часта дзейнічаючыя напаказ дзеля ўласных інтарэсаў.

І фактычна, цяжка не пагадзіцца са спадаром еўрадэпутатам. На еўрасаюзным спіску няма не толькі г.зв. рэгіянальных выканаўчых органаў, але, для прыкладу, і рэктараў вышэйшых беларускіх вучэльняў, якія выкінулі студэнтаў удзельнічаючых у падзеях на Кастрычніцкай плошчы. Прапалі з першапачатковай версіі (NYT) таксама прозвішчы рэжымных журналістаў — рупараў прапаганды. Шукаў я на гэтым спіску спадарыні Лідзіі Ярмошынай, старшыні Цэнтральнай выбарчай камісіі. Няма. Але еўрадэпутат мне высветліў:

— Ярмошына апынулася на іншым спіску, ранейшым. Было там яшчэ пяцёх, замешаных у таямнічыя знікненні людзей. Агулам шасцёра. Лукашэнка ўжо тры тыдні таму, на сустрэчы ў вярхах ЕС, значыць, у час пасяджэння прэзідэнтаў і прэм'ер-міністраў ЕС, быў ахоплены забаронай уезду.

А вось спісак: Генадзь Нявыглас — шэф Адміністрацыі Прэзідэнта, Наталля Пяткевіч — намесніца шэфа Адміністрацыі Прэзідэнта, Анатоль Рубінаў — намеснік шэфа Адміністрацыі Прэзідэнта, Алег Праляскоўскі — начальнік ідэалагічнай управы Адміністрацыі Прэзідэнта, Аляксандр Радзькоў — міністр адукацыі, Уладзімір Русакевіч — міністр інфармацыі, Віктар Галаванаў — міністр юстыцыі, Аляксандр Зімоўскі — старшыня Белдзяржтэлерадыёкампаніі, Уладзімір Канаплёў — старшыня Палаты прадстаўнікоў (ніжэйшай палаты парламента), Мікалай Чаргінец — старшыня Савета Рэспублікі (вышэйшая палата парламента), Сяргей Касцян — дэпутат Палаты прадстаўнікоў, Міхаіл Орда — дэпутат Палаты прадстаўнікоў, Мікалай Лазавік — сакратар Цэнтральнай выбарчай камісіі, Пётр Міклашэвіч — генеральны пракурор, Алег Сліжэўскі — начальнік дэпартамента грамадскіх арганізацый Міністэрства юстыцыі, Аляксандр Харытон — галоўны спецыяліст дэпартамента грамадскіх арганізацый Мінюста, Яўген Смірноў — віцэ-старшыня Вышэйшага гаспадарчага суда, Надзея Рэуцкая — суддзя Раённага суда ў Мінску, Мікалай Трубнікаў — суддзя раённага суда ў Мінску, Мікалай Купрыянаў — намеснік генеральнага пракурора, Сцяпан Сухарэнка — старшыня КДБ, Васіль Дземянцей — віцэ-старшыня КДБ, Леанід Козік — старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, Аляксандр Каляда — член Цэнтральнай выбарчай камісіі, Мікалай Усаў — член ЦВК, Леанід Лучына — член ЦВК, Таццяна Краўчанка — член ЦВК, Уладзімір Курловіч — член ЦВК, Мікалай Мяцеліца — член ЦВК, Міхаіл Пішчулёнак — член ЦВК.

Мацей Халадоўскі

На аўтафуры ў манастыр

(пачатак у 16 н-ры)

У манастыры не дазволяць падаць запіску за здароўе добрых шафёраў:

— Хто іх там ведае, — павучае манах з клапатлівай усмешкай, — а можа яны нехрысты якія?

Лешак змагаецца за нас як узорны хрысціянін. Па радыё Сі-бі знаходзіць далейшы транспарт, яшчэ і рэкамендуе нас, як важных панюсяў.

— Mam dwie sympatyczne panie do Dorohuska!

Аўтафуршчыкі — салідарныя браткове.

— Jestem na moście, gdzie się zatrzymać? — пытае голас па Сі-бі-радыё.

Выкарасківаемся з аўтафуры Лешка і ўжо чакае нас Марк. Дзеля нашай выгады і камфорту хлопцы парушаюць дарожны закон, свае *кіламетровыя* аўтафуры спыняюць у заточцы для аўтобусаў у цэнтры Любліна.

У пузатай аўтафуры Марка адчуваем сябе як дэлегаты тайнай місіі. Шафёр тактоўна не цікавіцца куды і навошта едзем. Наадварот, трэба яго цягнуць за язык, каб рассакрэціў тое-сёе са сваіх падарожжаў. Марк пятнаццаць гадоў ездзіць па свеце, значыць, па Еўропе і Азіі. Быў у Іркуцку, быў у Іраку, адным словам — усюды. А зараз таксама з далёкага свету вяртаецца, ажно з Харватыі. Да сямейкі завітае ўжо на Вялікдзень.

— То з Харватыі бензін возіце? — пытанне наклікае самавітая цыстэрна за плячыма.

— Ха-ха-ха, гэта апельсінавы сок.

— Ы-ы... сок?

— А што тут такога? Раней курыныя жаўткі цыстэрнамі ў Італію пастаўляў.

* * *

— Гэта мой апошні раз. Слова „апошні раз" Алекс вымаўляе з палёгкай. У яго аўтафуру патрапляем зноў дзякуючы бескарыснай дапамозе Марка і радыё Сі-бі.

— Jadę w kierunku Kijowa, — інфармуе голас, — chętnie zabiorę panie.

— Dziękuję, ziomek, ja też z Pomorza, — дзякуе ад нашага імя Марк. Наш транс-поспех застаўляе ясней глянуць на свет і няшчасны чалавечы род. Надвор'е прасвятляецца, адплываюць чорныя хмары, перастае падаць дождж са снегам.

Цяпер едзем у аўтафуры загружанай нямецкімі сметніцамі. Сметніцы пакуль у частках, Алекс вязе іх у Жытомір, бо там танны работнік. Украінцы паскладваюць іх, а Алекс назад павязе іх у Нямеччыну.

— Самы вялікі кашмар на мяжы, — наракае Алекс, — з маім таварам часам двое сутак правяраюць.

Пасля Вялікадня пойдзе працаваць у прыватную фірму. На аўтафуры, як кажа, прасвістаў сем найлепшых гадоў. „Усё для грошыкаў", — заяўляе з рукой на сэрцы. Ды што з таго, калі ўласныя дзеці сталі ўспрымаць яго як чужога дзядзьку. Зараз нарадзілася ў іх дачушка і Алекс хоча выправіць памылкі.

— Прафесія аўтафуршчыка, — падводзіць, — для кавалераў або пенсіянераў.

Найбольш карысці маюць аднак апошнія, пенсіянер за рулём аўтафуры звычайна перажывае другую маладосць.

— І ўсе яны пруцца ў Сібір, — усміхаецца пад вусам Алекс, — бо там дзяўчаты гарачыя! Калі ў бары да рання скача нейкі стары з дзеўкамі, — Алекс дасць за гэта голаў, — ён, няйначай, паляк. І абавязкова ў ролі боса. Пасля голы і босы вяртаецца ў Польшчу, плача, што мафія яго абакрала.

— А думаеце такі шчупачок мафіі патрэбны? — Алекс заўсміхаецца ад жэжкіх успамінаў.

* * *

На мяжы пакідаем Алекса, які вымушаны стаяць у чарзе ў тры кіламетры. Граніцу перасякаем з кантрабандыстам Колем з Турысцка пад Ковелем, дзе, як сам заяўляе з гонарам, усе яго ведаюць.

— Спытай дзе жыве „рускі", — кожны скажа! Яго папулярнасць бярэцца яшчэ і з-за сабачага хобі. Коля паказвае нам пашпарт сукі Альбы і яе патрнёра Джыгара. У машыне таксама труба, якой кліча сваю сабачую пару пасля палявання. Зараз, калі чатыры гадзіны чыпім на мяжы, кантрабандыст дастае трубу і гудзе на ўцеху дзяўчат, якія швэндаюцца ўздоўж бясконцага шэрагу машын.

— Эх, жанчыны, — Коля называе сябе старым грэшнікам, — яны жывы скарб Украіны!

Наш шафёр родам з Сібіры. На Украіну папаў яшчэ пры савецкім часе. Тут, у Луцку, служыў у арміі.

— І закахаўся як дурны!

Значыць, закахаўся як трэба, бо жонка ў яго — проста „прэлесць".

— Украінкі, — міргае залётна Коля, — *жэншчыны нежны.*

Праўда, наш шафёр крыўдуе на сваіх дзяцей, якія запісаліся ўкраінцамі і не хочуць размаўляць паруску.

— А ў нас, у Расіі, гэтыя нацыянальнасці наследуюць толькі па бацьку, — кажа з нотай крыўды, — калі прозвішча па бацьку дык і нацыянальнасць такая. А тут усё наадварот, усім баба трасе! — Коля ведае што гаворыць. Яго цешча ў трыццаць год да хрысту пагнала. Заявіла, што парадак у хаце патрэбны, каб бацька ў прыклад дзеткам быў.

— Вашы сыны таксама кантрабандай папяросаў і гарэлкі займаюцца?

— Ды не, — хітра ўсміхаецца Коля, — яны ў паліцыі служаць!

* * *

За чатыры гадзіны чакання на мяжы Коля кажа, што палюбіў нас больш за родныя сёстры.

— Прыязджайце да нас у Сібір, — запрашае, хоць сам ужо дзесяць гадоў не быў на бацькаўшчыне. — У нас, у Расіі, людзі лепшыя як на Украіне. Зойдзеш у выпадковую хату, хоць уначы, цябе гарбатай пачастуюць.

Коля таксама лепшы за ўсіх нашых шафёраў, ён сам хоча павярнуць са шляху і дзвесце кіламетраў везці нас у манастыр. На шчасце тэлефануе ягоная жонка...

На развітанне наш кантрабандыст сыпле ў рукі гурбу чырвоных яблыкаў. Яблыкі належаць жанчыне з суседняй машыны, якіх Коля „дапамагае" перавезці цераз мяжу.

(працяг будзе)

Ева СЦЕПАНЮК

Тужу па нашай мове

[1 ☞ працяг]

не, Шанхаі ці Ганконгу цяпер сустракаецца ўвесь свет. І на канец смешная гісторыя — у Ганконгу я сустрэў знаёмага з Варшавы, з якім не бачыўся два гады.

— ***Ці меў Ты нагоду паехаць самастойна ў „дзікую" глыбінку? Калі так, які там кантраст паміж правінцыяй і сталічным Пекінам.***

— Была, аднак не цалкам самастойная. Гэта была арганізаваная паездка для замежных журналістаў, аднак „дзікая глыбінка" аказалася сапраўды „дзікай". І гэта другі бок Кітая, у якім жыве 900 мільёнаў (!!!) сялян. Я дагэтуль апісваў Кітай вялікіх метраполій, багатых людзей, магчымасцей. А ёсць яшчэ нашмат большы Кітай „немагчымасцей". Кітайцы робяць што могуць, каб развіваць вёскі. Нягледзячы на тое, 1 600 кіламетраў на поўдзень ад Пекіна ў прыгожых велізарных гарах, паміж якімі рвуцца рэкі, людзі жывуць як у XIX стагоддзі. У снежні бачыў я як кітаянкі мыюць бялізну ўручную проста ў рацэ. Бачыў я таксама прыватныя „шахты" ля дамоў, дзе людзі выбіраюць вугаль з зямлі. І гэта два супрацьлеглыя бакі Кітая, а іх — мне здаецца — яшчэ больш. Проста, каб сапраўды пазнаёміцца з сучасным Кітаем, трэба, па-першае, у ім правесці прынамсі год і многа падарожнічаць.

— ***У Іраку Ты тужыў па „Басовішчы" і Белавежскай пушчы. Якія ўспаміны грэюць Цябе ў Кітаі?***

— Сталася нешта незразумелае — маю надзею, што калі ўжо праз некалькі гадоў удасца мне вярнуцца ў Польшчу на даўжэй чым на паўгода, то пабудую хату ў Белавежскай пушчы, непадалёк ад Гайнаўкі. Па лесе тужу, па беларускай мове, якой зрэдку, на жаль, карыстаюся. У думках часта вяртаюся да часоў, калі вучыўся я ў Беларускім ліцэі ў Гайнаўцы і працаваў у Беларускай рэдакцыі Польскага радыё таму, што без гэтых двух магічных для мяне месцаў не было б нічога ў маім жыцці, што для мяне найважнейшае.

— ***Як правядзеш надыходзячы Вялікдзень?***

— Каталіцкі — з польскімі знаёмымі, а праваслаўны — спадзяюся, што на Усяночнай у расійскім пасольстве, а потым разам з сябрамі з Расіі, Сербіі і Балгарыі.

— ***Які зараз год у Кітаі?***

— Паводле месячнага календара — 4703, але важнейшае для кітайцаў тое, што сёлета Год Сабакі. Гэта абазначае добры год для інвестыцый.

Гутарыла Ганна КАНДРАЦЮК

Мінулае Броўска

Дзвесце гадоў таму Броўскам называлі паселішча на беразе Нарвы. У ім жыў леснік, што даглядаў за „абходам" на паўночным рубяжы Белавежскай пушчы. Крыху пазней тут заснавалі Броўскае надлясніцтва. Пасля вайны Броўск апынуўся за ўсходняй граніцай, аднак яго імем названа вялікае зараз надлясніцтва, якое ахоплівае пушчу ад ракі Нарвы на поўначы да рэчак Нараўкі і Гвознай на поўдні. Нядаўна далучылі яшчэ Лядскую пушчу. І такім чынам назва Броўск, хоць і адарвалася ад свайго кораня, усё ж жыве і расшырае свой абсяг.

Гэты абшар лесу мае багатую гісторыю. Ва ўрочышчы Гайдукі археолагі знайшлі пахаванне дзіцяці з III-IV стагоддзяў нашай эры ды курганы. У міжрэччы Гвознай і Нараўкі нашы продкі пакінулі шмат курганоў, якія яны насыпалі на магілах сваіх родзічаў. Адзін з такіх курганоў у пушчы знаходзіцца непадалёк дарогі з Масева ў Альхоўку.

Не толькі ў зямлі захаваліся помнікі адлеглых часоў. Са старажытных летапісаў вядома, што гэтыя землі ў XII-XIII стагоддзях былі месцам актыўнага дзеяння князя валынскага Рамана Мсціславіча, яго сыноў: караля Данілы і князя Васілька ды іх нашчадкаў. У канцы XIII стагоддзя абшары верхняга цячэння Нараўкі, Нарвы ды Свіслачы пачалі сабе вырываць з рук князь літоўкі Трайдзень з поўначы і князь валынскі Уладзімір Васількавіч з поўдня.

Потым сюдою хадзілі атрады крыжакоў у свае грабежніцкія „райзы" на Камянец і іншыя гарады. У сакавіку 1410 года яны абрабавалі Ваўкавыск. А ў той самы час над Нараўкай і Гвознай кароль польскі Уладзіслаў Ягайла і вялікі князь літоўскі Вітаўт палявалі на пушчанскага звяра. Усю зіму Ягайлавы і Вітаўтавы воі тут, у вярхоўі Нараўкі і Нарвы, рыхтавалі харч для вялікага паходу аб'яднаных армій Польшчы і Вялікага княства Літоўскага на крыжацкую сталіцу.

У час паўстання 1863 года суха „груды" сярод непраходных топеляў у пушчы таксама былі надзейным сховішчам для паўстанцкіх атрадаў. **(мох)**

Беларусь, Беларусь

Штотыднёва аглядаю перадачу пад такім загалоўкам на першай праграме Польскага тэлебачання, якую вядзе Маргарыта Пракапюк. Вядучая па-беларуску гутарыць з прадстаўнікамі беларускага грамадства пра абставіны ў Беларусі. Бачу фільмы, як кардоны міліцыі забараняюць праводзіць сходы ў Гродне ці ў Мінску. І добра было б, калі б у рэшце рэшт улада ў Беларусі стала беларускай, каб беларуская мова атрымала належны ёй ранг. А то Лукашэнка ўсё па-руску і па-руску трымае. Ой, мне думаецца, што пальецца нявінная кроў на Беларусі, але пераможа свабода і беларускі дух, а Лукашэнка пойдзе ў калгас прымаць цялят ад кароў пры цяленні.

Андрэй ГАЎРЫЛЮК

Новыя досведы

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Удзельнікі праекта (злева): Міраслаў Кобаса, Аляксандр Пірагоў, Васіль Валасяк

Дэпутаты мясцовых саветаў і выкладчыкі вышэйшых навучальных устаноў Беларусі, якія з 2 па 8 красавіка прымалі ўдзел у праекце „Блізкае самакіраванне. Беларусь і польскі досвед", наведалі самаўрадавыя ўстановы Беластока, Бельска-Падляшскага, Гайнаўкі і Чыжоў. Пазнаёміліся яны з новымі досведамі і хочуць распрацоўваць новыя праекты наконт сістэмы самакіравання ў Беларусі.

Госці распачалі працу з сустрэч наладжаных у Бельску-Падляшскім. Спаткаліся яны з намеснікам бельскага старасты Пётрам Божкам, які расказаў пра Бельскі павет, яго козыры і праблемы, якія трэба вырашаць уладам. Пра выбары ў самакіраванне і выбарчыя законы гаварыў былы бурмістр Бельска, дырэктар Бельскага белліцэя Андрэй Сцепанюк. Удзельнікі праекта даведаліся таксама пра еўрапейскія фонды і праграмы, сродкамі якіх карыстаюцца ў Бельску-Падляшскім, і пазнаёміліся з гарадскімі інвестыцыямі.

— Мяне зацікавілі справы выбарчага заканадаўства датычнага самакіравання. Калі будзем ведаць добрае заканадаўства, зможам у будучыні прымяніць яго ў сябе. Важна таксама арганізаванне ініцыятыўных груп, якія прыступаюць да выбараў і вопыт наконт назірання за выбарамі, каб яны былі справядлівымі, — сказала Валянціна Кудлацкая, дэпутат Раённага савета Верхнядзвінска (Віцебская вобласць). — Я бачу, што ў Польшчы вельмі хутка можна зарэгістраваць выбарчы камітэт, а ў нас з гэтым больш складаная справа. У Беларусі абмежаваны таксама магчымасці агітацыі. Нашы кандыдаты ў мясцовае самакіраванне могуць выступіць толькі адзін раз на радыё і тэлебачанні ды змясціць адну інфармацыю ў газеце. Мы не можам таксама падрыхтаваць свой ролік для тэлебачання. Людзей, якія не ідуць з прапрэзідэнцкімі структурамі, лічаць у нас апазіцыянерамі і могуць іх у сродках масавай інфармацыі прадставіць у адмоўным святле. Калі хто балатуецца кандыдатам ад дзяржаўных структур, мае большыя шанцы стаць дэпутатам.

Валянцін Карыцкі, кіраўнік Бельскага павятовага бюро Агенцтва рэструктурызацыі і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі расказаў пра еўрапейскія праграмы дапамогі сельскай гаспадарцы. Беларускія госці цікавіліся велічынёй еўрапейскай дапамогі і размерам падаткаў, каб параўнаць прыбытковасць сельскай прадукцыі ў суседніх краінах.

— Нам цікавы вопыт рэфармавання мясцовага самакіравання. Мяне зацікавіў спосаб выбару кіраўнікоў мясцовага самакіравання, бо ў нас такія асобы назначаюцца прэзідэнцкімі структурамі і на іх выбар дэпутаты не маюць уплыву, — гаварыў Васіль Валасяк, дэпутат Пухавіцкага савета. — Зацікавіўся я таксама камандзіровачнымі вашых радных, бо нашы дэпутаты працуюць на грамадскіх пачатках, без льгот і кампенсацыі за час патрэбны для працы ў савеце.

У Павятовым ведамстве працы ў Бельску-Падляшскім ішла гаворка пра беспрацоўе ў Бельскім павеце і еўрапейскія праграмы па змяншэнню беспрацоўя.

— Я цікаўлюся справамі беспрацоўя, бо яны тычацца і маёй мясцовасці, Оршы. У нас закрылі завод швейных машын і будаўнічае прадпрыемства. Без працы апынуліся ў галоўным мужчыны, якія выязджаюць зараз за работай у Расію, Польшчу, Чэхію ці нават Англію. Апошнім часам пачалі ў нас больш будаваць і крыху асоб знайшло работу на месцы, — сказала Святлана Рыжыкова, дэпутат Аршанскага савета. — Важная для нас таксама справа арганізавання часу на адпачынак для моладзі. У нашай мясцовасці дзейнічае толькі адзін маладзёжны цэнтр. Растуць злачынасць, наркаманія і таму ёсць месца для грамадскай работы.

У Гайнаўцы ўдзельнікі праекта спаткаліся са старастам Уладзімірам Пятрочукам і працаўніком староства Валянцінай Горбач, якія расказалі пра супрацоўніцтва самакіраванняў Польшчы і Беларусі ў межах еўрарэгіёна „Белавежская пушча". У Гайнаўскім белліцэі настаўнікі беларускай мовы пазнаёмілі гасцей са сваімі аўтарскімі падручнікамі і праграмамі па навучанню роднай мовы.

— Адметнасцю рэалізаванага намі праекта з'яўляецца яго фінансаванне Шведскай асацыяцыяй мясцовых абшчын „SAŁA". У час яго рэалізацыі будзем знаёміцца з вопытам у галіне самакіравання Польшчы, Літвы і Расіі. Выкладчыкі вышэйшых устаноў, юрысты, эканамісты і гісторыкі, якія прыбылі ў Польшчу, з'яўляюцца нашымі экспертамі і будуць распрацоўваць новыя ідэі па мясцовым самакіраванні. Выдаем мы бюлетэнь „Мясцовае самакіраванне", кніжкі і брашуры, — паінфармаваў Міраслаў Кобаса, старшыня Фонду імя Льва Сапегі з Мінска, які з'яўляецца арганізатарам праекта з беларускага боку.

У Беластоку дэпутаты і выкладчыкі спаткаліся з еўрадэпутатам Барбарай Кудрыцкай і даведаліся пра дзейнасць польскіх еўрадэпутатаў. Сустрэліся таксама з працаўнікамі Маршалкоўскай управы, якія расказалі аб працы ваяводскіх самаўрадавых структур. Госці наведалі Радыё „Рацыя", якое вяшчае на Беларусь на сярэдніх хвалях.

Георгій Куневіч, юрыст Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў Мінску, сачыў за выбарчымі законамі адносна самакіравання ў Польшчы.

— Можа праз 5-10 гадоў і ў нас будзе рэфармавацца сістэма самакіравання і тады можна будзе выкарыстаць польскі досвед, — заявіў Георгій Куневіч.

— Мяне цікавіць фінансавы бок сістэмы самакіравання ў Польшчы, — сказаў Дзмітрый Сокал з Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта ў Мінску. — Я якраз выступаю з лекцыямі наконт фінансавых сістэм замежных краін.

Выкладчыкі з Беластока дэталёва пазнаёмілі ўдзельнікаў сустрэч з арганізацыйнай структурай, кампетэнцыямі і задачамі ваяводскіх, павятовых і гмінных самаўрадаў і іх фінансавай гаспадаркай. За дакладамі ўважліва сачыў Аляксандр Пірагоў, каардынатар праграмы ад імя Шведскай асацыяцыі мясцовых абшчын.

— Наша асацыяцыя займаецца міжнароднымі праграмамі па адукацыі ў галіне самакіравання. Працуем мы ў Сербіі, Расіі, Грузіі, Украіне і Беларусі. Многія краіны карыстаюцца вопытам Швецыі, якая многа часу адводзіць сістэме самакіравання, — гаварыў Аляксандр Пірагоў са Шведскай асацыяцыі мясцовых абшчын. — У Беларусі рэформы мясцовага самакіравання трэба пачынаць з нуля. Зараз мы праводзім адукацыю беларускага насельніцтва. Рэалізуем праект адукацыі палітыкаў і служачых. Вучым іх не толькі вопыту іншых краін, але і мясцовым законам. Выдаем літаратуру па справах арганізавання самакіравання і розных досведах у гэтай галіне.

У Чыжах госці спаткаліся з войтам гміны Юрыем Васілюком, які расказаў пра арганізацыйную структуру сваёй гміны і поспехі ў галіне інвестыцый. Адбылася таксама сустрэча з гаспадаром Янам Адамчуком, які гаварыў пра работу ў сельскай гаспадарцы на прыкладзе сваёй дзейнасці.

Аляксей МАРОЗ

Дагледжанае сяло Дубна

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

З Боцькаў у Дубна чатыры кіламетры, выдатная дыстанцыя для прагулкі праз свяжэючы для прывітання вясны водар, праз тую сумесь выпарэнняў стомленага снегу і адпачылай зямлі, нагода для прагулкі праз своеасаблівы пагранпераход з краіны зімы ў краіну вясны. На дарозе ўжо вясна ў выглядзе чорнага асфальту, а ў вёсцы — як у вёсцы — адсталасць у выглядзе старога і непрыязнага, як казачны Кашчэй, мокрага снегу. Асабліва той снег непрыступны ў своеасаблівай глыбінцы, куды снежныя плугі заглядаюць у крайнім выпадку. Такі снег ляжыць на бакавой вуліцы Дубна, па якой кіруюся да тамашняга гаспадара вёскі.

Хаця названая вуліца, як па-нашаму можна сказаць, з краю, салтысоўскае сужонства ў цэнтры тамашняга грамадскага жыцця. Ніна Гуральчук ужо трэці тэрмін гміннай раднай у Боцьках, а Яўген Гуральчук з'яўляецца не толькі солтысам, але і душою вясковай пажарнай каманды.

У пажарнай камандзе ў Дубне дваццаць двух чалавек ад васемнаццаці да шасцідзесяці гадоў. Каманда нядаўна атрымала новы самаход „Форд". Такая невялікая машына тут таму, што гараж, у якім яна стаіць, не мае абагравання і нават калі б быў вялікі самаход з бакам для вады, нельга было б яе ў ім трымаць. Дарэчы, пажарная каманда ў Боцьках — адзіная ва ўсходняй частцы гміны — карыстаецца вадою з гідрантаў, падключаных да водаправодаў, якія пракладзены ва ўсе вёскі Боцькаўскай гміны. У мінулым годзе каманда выязджала да аднаго пажару, але бывалі такія перыяды, калі пажары ўспыхалі і штотыдзень. Пажарнікі з Дубна актыўныя, у мінулым годзе выпаў ім гонар ладзіць гмінныя пажарныя спаборніцтвы. У гміне яшчэ дзве вартасныя каманды ў Боцьках і Выганове; ёсць яшчэ і пажарная каманда ў Андрыянках.

Спадарства Гуральчукі прапануюць і агратурыстычную гасціну. Начавалі ў іх людзі з цэлай Польшчы: з Вроцлава, Познані, Кракава, Варшавы. Нейкі час пражывалі археолагі, якія цікавіліся астаткамі збудаванняў колішніх уласнікаў Дубна, Сапегаў. Ян Сапега стаў уласнікам Дубна ў 1512 годзе, а ягоны сын Павел пабудаваў тут замак. Археолагі гаварылі, што адкапалі метровы мур з паловы XVI стагоддзя. Будынкі сям'і Сапегаў стаялі на зямлі, якую цяпер абрабляюць Гуральчукі і іхнія суседзі. Былі ў Дубне і іншыя гаспадары, якія рыхтаваліся да агратурыстычнай дзейнасці, але не адважыліся на гэта.

У Дубне чатырох гаспадароў мае ўмяшчальнікі на малако, шмат іншых трымае па 10-12 кароў і здае малако ў мясцовы пункт прыёму гэтай сыравіны. Крыху сялян трымае па некалькі свіней. Калісь жыхары Дубна садзілі многа трускалак, але іх цана ўпала і гэты від сельскагаспадачай прадукцыі страціў рэнтабельнасць.

У Дубне землі добрыя, нават бурачаныя ёсць, толькі меншае лік ахвотных іх абрабляць. Земляробы найчасцей абсяваюць іх жытам і пшаніцай. Прадаць збожжа можна, напрыклад, Гуральчукі сваё збожжа прадалі на корм у Паканева, дзе вядзецца гадоўля рыб у дваццаці пяці ставах, якіх агульная плошча сягае за сто гектараў. Рыбаводам з Паканева прыходзіцца цяпер змагацца з замежнай канкурэнцыяй — не толькі з Украіны ці Славакіі, але нават з Кітая! Некаторыя жыхары Дубна таксама былі выкапалі сажалкі для рыбаводства, але ўпаў у іх узровень вады і давялося адмовіцца ад гэтага занятку.

Пункт прыёму малака ў Дубне стаіць каля расхадных вуліц. Побач яго і вялікі будынак святліцы, у якім таксама мае свой адсек і пажарнае дэпо. А вось крамы ў Дубне няма, бо не ўсе ёй рады; лічаць, што дастаткова крамы ў адлеглым за два кіламетры Нурцы. Бо ў Дубне знайшліся б шматлікія заўсёднікі, якія не толькі днявалі б, але і начавалі б у недалёкім лесе. І пажар такія маглі б зацерушыць, але ж пажары пажарнікам непатрэбныя, адно небяспечныя не толькі ім.

У лесе побач вёскі могілкі. Хаваюць на іх пакойнікаў з Дубна і з Нурца; калі ў каго сваякі пахаваныя ў Боцьках, бывае, што сям'я вязе туды і чарговых пакойнікаў. На могілках сем гадоў таму вяскоўцы пабудавалі невялікую капліцу. Адпраўляць у ёй набажэнствы бацюшка з Боцькаў прыязджае двойчы ў год: на свята Жанчын-міраносіц два тыдні пасля Вялікадня і на Галавасека.

У Дубне два аўтобусныя прыпынкі, павеці на іх паставілі самыя жыхары вёскі, а гміна пагасіла кошты расходаваных матэрыялаў. Нядаўна адноўлена вулічнае асвятленне, а перад самымі маразамі на вуліцы, праз якую праходзіць шлях з Боцькаў у Нурэц і далей, быў пакладзены новы асфальт.

Каля пятнаццаці дзяцей з Дубна вучыцца ў комплексе школ у Боцьках. У мінулым дзеці вучыліся ў Нурцы, цяпер там у былым школьным будынку дом для састарэлых. Для новых карыстальнікаў той будынак быў разбудаваны, цяпер у ім прабывае каля сямідзесяці чалавек і яшчэ месцаў малавата. А вось у недалёкім Красным Сяле прыгожы будынак былой школы не можа дачакацца новага прымянення і пападае ў руіну.

На фоне іншых вёсак нашай Усходняй сцяны Дубна выглядае даволі прыстойна. Старыя хаты ёсць, але яны перспектыўныя: яшчэ зіма не забрала сваёй белай вопраткі для абнаўлення, а ўжо гаспадары старых дамоў выйшлі прыхарошыць іх для прыёму вясны. Значыць, у Дубне хаты не будуць пуставаць. А варта ў гэтым месцы прыгадаць, што калісь уладальнікі наваколля Боцькаў, у тым ліку і Сапегі, заўзята змагаліся за мясцовыя вёскі, не ганьбуючы і рукапрыкладствам. Можа так тут выспявалі ваенныя таленты слаўнага гетманскага роду.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Зубры не чакалі

Нядаўна пісаў я аб планах перасялення часткі зубрынага статка з Белавежскай пушчы ў вялікія лясныя масівы на тэрыторыі колішніх Блудаўскай і Мельніцкай пушчаў. На жаль, калі я размаўляў аб гэтай справе ў старостве ў Сямятычах, то пачуў, што гэтая ідэя не выйшла яшчэ па-за рамкі ўступнага праекта, далёкага яшчэ да распрацоўкі дэталяў, прыдбання фондаў, а тым больш і самой рэалізацыі. Аднак гэты праект павінен станоўча вырашыць праблему росту колькасці зуброў, паколькі жывёла, як мне здаецца, сама пачынае гэтую ідэю ажыццяўляць.

Вось нядаўна лакальны штотыднёвік „Глос Сямятыч" паведаміў, што зубры самі ўжо перасяляюцца ў лясы колішняй Мельніцкай пушчы, паколькі паасобныя жывёлы былі ўжо заўважаны ў наваколлі вёсак Клюкавічы (Нурэцкая гміна) і Мутная (Мельніцкая гміна). Жыхары Клюкавіч зубра бачаць даволі часта, бо здаралася, што суправаджаў кароў на пашы. Каля Мутной больш лясоў, у якіх можна сустрэць „цара пушчы". Такія адзінокія зубры гэта самцы, якія перамяшчаюцца ў пошуках спакойных для жыравання месцаў, свабодных ад канкурэнцыі маладых быкоў. І калі раз тут паявяцца, дык пачнуць штораз часцей вяртацца на новую тэрыторыю.

І хай так будзе! Бо калі чакаць адміністрацыйных рашэнняў, то можа і зубрынага жыцця аказацца замала. Толькі ці гэтая зубрыная ініцыятыва не супярэчыць еўрапейскім дырэктывам Бруселя? Што на гэта Еўрапарламент?

М. Ц.

Агратурызм

Найбольш агратурыстычных кватэр у Нараўчанскай гміне (Гайнаўскі павет) — у Новым Ляўкове, Старым Ляўкове, Нараўцы, Новай Луцэ, Масеве, Міклашэве, Грушках, Плянце, Сушчым Барку, Елянцы і Заблотчыне. У мінулым годзе ўласнікі агратурыстычных гаспадарак аб'ядналіся. Старшынёю праўлення гуртка выбралі Іаланту Стыпулкоўскую з Новага Ляўкова, а членамі праўлення Аліцыю Карчэўскую, Аляксандра Шыманюка, Ірэну Кісялеўскую і Уладыслава Грыку.

Якія атракцыёны кватэранаймальнікі прапануюць турыстам у Нараўчанскай гміне? Зімою, між іншым, прагулкі на санках-шытках па лясных дарогах Белавежскай пушчы. Апрача таго ў Плянце — бульбяную „бабку", у Сушчым Барку — жытні хлеб, у Новым Ляўкове і Навінах — пчаліны мёд. У Новым Ляўкове можна купацца ў саўне, малаціць цэпам жыта, чысціць у арфе-веялцы, змалоць зерне ў жорнах, замясіць цеста ў дзежцы ды самастойна спячы хлеб у печы. У Плянце можна купіць шмат якія сушаныя лекавыя зёлкі. Турыстам можна паказаць дзе ў рэчцы Нараўцы водзяцца бабры, а таксама дрэвы-помнікі ў лясах Белавежскай пушчы. **(мох)**

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Чорная пралеска

У адным царстве стаяў прыгожы горад, а назву ён меў — Прыпяць-горад. І жылі ў ім усе дружна, шчасліва.

Аднойчы сабраліся разумныя людзі гэтага горада і вырашылі пабудаваць такую цуда-машыну, якая магла б здзівіць свет. Спяшаючыся, пабудавалі яе за кароткі час. Вялізную-вялізную, усім здалёк відаць была. Радаваліся людзі: яна асвятляла не толькі свой горад, але і гарады, і вёскі суседніх царстваў. Так працягвалася не адзін год. Кожную вясну сыходзіў снег, распускалася лісце на дрэвах, зацвіталі блакітныя пралескі, нараджаліся ў царстве здаровыя малышы-асілкі.

Ды нечакана прыйшла ў Прыпяць-горад бяда: з-за недагляду людскога ўзарвалася цуда-машына, і заслалася ўсё навокал чорным попелам, як крумкачовым крылом. Пачало сохнуць лісце на дрэвах, пажоўкла трава ля дарогі, а блакітная пралеска стала чорнай. Шмат людзей загінула ад гэтай бяды — чорнага попелу. Астатнія як ні стараліся, ім так і не ўдалося справіцца з бядою. Страх апанаваў жыхароў Прыпяць-горада. Пачалі ўцякаць яны з горада, пакінуўшы ўсю сваю маёмасць.

Кінулі кліч іншым царствам: „Дапамажыце выратаваць нашу зямлю, нашых дзяцей, якія гінуць ад хвароб!"

Пачулі кліч той уладары іншых дзяржаў і кінуліся дапамагаць Прыпяць-гораду: хто розумам, хто дабром, хто гасціннасцю ды добрым словам.

Прайшло шмат гадоў. Разам перамаглі людзі бяду. Адрадзіліся гарады і вёскі, выраслі новыя сады, і толькі чорная пралеска нагадвае людзям пра тое, што нічога на зямлі не праходзіць бясследна, аб тым, што ўсё ў жыцці трэба рабіць з розумам ды развагай.

Аляксандра Афанасьева
Мінская вобласць, Барысаўскі раён, в. Вялікае Стахава

Беластоцкія гімназісты ля сейненскай сінагогі

Памяць і экалогія

Пад такім загалоўкам у Сейнах праходзіла міжнацыянальная сустрэча моладзі, наладжаная ў памяць 20-й гадавіны Чарнобыльскай катастрофы. Сустрэча адбылася 12 красавіка г.г. Удзельнічалі ў ёй маладыя літоўцы з Пуньска, палякі з Сейнаў і Сувалкаў, беларусы з Беластока. Нашу меншасць даволі ярка (былі першымі ў дыскусіі) прадстаўлялі гімназісты, навучэнцы беларускай мовы.

Галоўная тэма сустрэчы — знішчэнне сучаснага свету. І не ідзе адно пра канкрэтнае забруджанне прыроды, але і знішчэнне духовых каштоўнасцей чалавечага роду, будаваных на працягу стагоддзяў. Прыклад гэтаму — разбураны двор у Краснагрудзе — месца звязанае з паэтам Чэславам Мілашам, лаўрэатам Нобелеўскай прэміі. Зараз за яго, пакуль духовае, аднаўленне ўзяліся маладыя з Асяродка мастацтва, культур, нацыянальнасцей у Сейнах. Яны запісалі ад вясковых людзей успаміны пра жыхароў і асаблівасці двара.

— Якая сувязь паміж дваром у Краснагрудзе і Чарнобыльскай катастрофай? — разважалі ўдзельнікі.

Чарнобыльская катастрофа — знак часу, сімвал знішчэння, прадказаны яшчэ ў Апакаліпсісе. Там завецца яна „зоркай-палыном", а, вядома, слова „чарнобыль" па-беларуску значыць палын. Трагедыя ў Чарнобылі звязаная не адно з забруджаннем свету, яна назначана выгнаннем тысяч людзей, якія вымушаны былі пакінуць роднае месца. Прыкладам паслужыў тут фільм „Чарнобыльцы" беларускага рэпартажыста Юрыя Каліны. Фільм паказвае боль выгнанніка, яго трагічны сум па месцы нараджэння, па родным краявідзе. Чалавек „на чужыне", нават калі там у яго лепшыя ўмовы жыцця, хварэе. Гэта — настальгія па духовым свеце, які рэдка ўдаецца адрадзіць на новым месцы. Доказам — паэзія Чэслава Мілаша, які, пражываючы ў Амерыцы, прызываў дух і краявід роднай Літвы.

Інтэлектуальныя разважанні моладзі ўзбагацілі экскурсія ў Краснагруду і спектакль „Сейненскія хронікі". Спектакль наладжаны на аснове ўспамінаў пра даваенныя лёсы жыхароў Сейнаў. Дзяўчаты і хлопцы апавядаюць у ім жыдоўскія, літоўскія, стараверскія ды польскія лёсы, спяваюць іх песні, дэкламуюць малітвы. А самае самавітае — яны самі адшукалі і спісалі гэтыя гісторыі і зараз займальна паказалі іх сваім аднагодкам.

— Мы зусім не ўмеем належным чынам ацаніць сваіх бабуль і дзядоў, — кажа Ірэна з Пуньска, — нам здаецца, што яны несучасныя, што ў іх расказах няма нічога цікавага. А ёсць наадварот — там мы пазнаем саміх сябе!

Чарнобыльская сустрэча адбылася па ініцыятыве міністр Евы Юнчык-Зямецкай, якая разам з гаспадарамі ўвесь дзень вяла жывы дыялог з моладдзю.

Ганна Кандрацюк

Польска-беларуская крыжаванка № 17

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 13: Склон, Ас, карал, кок, гад, ліпа, камора, кол, фэст, Лі, сэрца, шанец, карона, знак, парасон. Крок, сын, кафэ, мэр, госці, карта, вада, шар, вал, пара, лік, нос, поле, сталіца.

Узнагароды, аўтаручкі, выйгралі: **Сара Галубоўская, Кася Зданоўская, Раксана Раманчук, Кася Ватароўская** з Нараўкі, **Якуб Андрацкі** з Саколкі, **Агнешка Апольская, Юліта Кананюк, Агнешка Анікіюк** з Нарвы. Віншуем!



Міра Лукша

Чорная быль

Ой, ляцелі гусі
Па-над Беларуссю,
Без карты ляцелі,
на роднае селі.
Няма таго месца,
Дзе б можна пасесці —
Вёску з карты сцерлі?
Ці мо людзі ўмерлі?
Выглядаюць вочы
хатаў сярод ночы,
Дзверы расчыняюць,
сваякоў чакаюць.
Ой, ляцелі хмары
Без вайны пажару...

Беласток пераможа

Бабікі разам

Найлепшыя дэкламатары

Дванаццатага красавіка ў Нараўчанскім комплексе школ праводзіўся **трыццаць пяты** цэнтральны агляд Дэкламатарскага конкурсу „Роднае слова". Мала бракавала, што былі б перабоі ў тым, каб гэты конкурс, арганізаваны для вучняў школ, дзе навучаецца беларуская мова — пачатковых і гімназій, не атрымаўся. Міністрэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі, якое курыруе цяпер культурныя дзеянні нацыянальных меншасцей, спачатку рашыла не памагчы ў рэалізацыі вялікай колькасці мерапрыемстваў, якія арганізуе Беларускае грамадска-культурнае таварыства. Таварыстава запратэставала, стала прасіць і патрабаваць належнай яму дапамогі ў важных культурных справах, у розных установах, і справы абмеркавалі там нанава. У арганізацыі „Роднага слова" памагла таксама Маршалкоўская ўправа (самаўрад ваяводства), а таксама Нараўчанская гміна і школа, а перш за ўсё Пасольства Рэспублікі Беларусь у Варшаве і Генеральнае консульства РБ у Беластоку, прызначаючы прыгожыя і каштоўныя ўзнагароды пераможцам. У цэнтральным аглядзе прыняло ўдзел 117 удзельнікаў, адабраных у школьных, гмінных і павятовых элімінацыях. Журы вельмі справядліва старалася ацаніць знакамітыя выступленні і старанні маладых дэкламатараў, якія вельмі часта самі знаходзілі творы — паэзію і прозу — якія ім былі даспадобы, якія іх усхвалявалі, далі надэкламацыі творы, кранаючыя найглыбейшыя струны беларускай душы. Сапраўды, журы мела нялёгкую задачу — ацаніць і адпаведную падборку твораў, і мастацкае выкананне, і ўражанне ад яго, і моўныя справы. Узнагародзіць хацелася б усіх! Кожны стараўся, ужо ад восені, праходзячы праз шчыльнае сіта папярэдніх адбораў, пад наглядам настаўніц і бацькоў. І вось як журы, пад кіраўніцтвам Тамары Русачык, ацаніла старанні таленавітых беларускіх дэкламатараў:

Паўлік Гаінскі

Дашкольнікі. Вылучэнне: Малгося Васілюк (прадшколле н-р 3 у Гайнаўцы); **III месцы: Гаўрылка Сурэль** (прадшколле н-р 3 у Гайнаўцы); **II Габрыся Нічыпарук** (прадшколле ў Гарадку); **II месцы: Юстынка Якубюк** (прадшколле н-р 7 у Бельску), **Кася Грыка** (прадшколле ў Гарадку), **Паўлінка Дымовіч** (прадшколле н-р 3 у Гайнаўцы); **I месцы: Аня Нестэрук** (прадшколле н-р 3 у Гайнаўцы), **Магда Маліш** (школа ў Орлі), **Паўлік Гаінскі** (прадшколле н-р 14 у Беластоку), **Гран-пры: ФІЛІП ХОМІК** (прадшколле н-р 14 у Беластоку).

Класы I-III: Вылучэнні: Міхась Голуб (Супрасль), **Якуб Андрацкі** (ПШ н-р 1 у Саколцы), **Магда Яканюк** (ПШ н-р 3 у Бельску), **Іаанна Гурская** (Агароднікі), **Уля Сліўко** (ПШ н-р 3 у Бельску); **III месцы: Пётр Аўксянцюк** (ПШ н-р 2 у Гайнаўцы), **Аня Гуль** (ПШ н-р 3 у Бельску), **Уля Баравік (ПШ у Дубічах-Царкоўных), Марта Зінкевіч** (ПШ н-р 3 у Бельску), **Ганна Піскорская** (ПШ н-р 3 у Гайнаўцы); **II месцы: Магда Гаўрылюк** (ПШ н-р 3 у Гайнаўцы), **Дар'я Маліш** (Орля), **Аляксандра Сарокін** (ПШ н-р 3 Бельск); **I месцы: Юстына Апольска** (ПШ н-р 4 у Беластоку), **Уля Скепка** (ПШ н-р 3 у Бельску), **Магда Кубай** (ПШ н-р 3 у Бельску), **Гран-пры: МАГДАЛЕНА БАБІК** (ПШ н-р 4 у Беластоку).

Класы IV-VI: Вылучэнні: Марыся Масальская (ПШ н-р 3 у Бельску), **Пётр Герасімюк** (Дубіны), **Якуб Сухадола** (Нараўка), **Паўліна Варановіч** (Бабікі), **Дамініка Юшкевіч** (Нарва), **Івона Баршчэўская** (Орля), **Іаанна Насковіч** (ПШ нр-р 3 у Бельску); **III месцы: Наталля Міхалоўская** (ПШ н-р 2 у Гайнаўцы), **Ігар Фралоў** (ПШ н-р 4 у Беластоку), **Наталля Андрэюк** (ПШ н-р 3 у Бельску); **II месцы: Ніна Ваўранюк** (ПШ н-р 4 у Беластоку), **Лідзія Пякарская** (ПШ н-р 4 у Беластоку), **Юстына Давідзюк** (Рыбалы); **I месцы: Грыша Красоўскі** (ПШ н-р у 3 Бельску), **Матэвуш Магрук** і **Якуб Філіпюк** (ПШ н-р 3 у Бельску), **Гран-пры: НАТАЛЛЯ ЛАЎРАНЮК** ПШ н-р 3 у Бельску) — узнагарода Пасольства і Генконсульства РБ.

Наталля Лаўранюк атрымала ўзнагароду з рук консула

Гімназіі: Вылучэнні: Мартына Валер'ян (Бельск), **Анна Раманюк** (Гайнаўка), **Марыюш Мак** (Бельск), **Адам Васільчык** (Нараўка), **Дамініка Лапцеў** (Бельск); **III месцы: Матэвуш Сэвастыянік** (гімназія н-р 7 у Беластоку), **Міхась Хмялеўскі** (гімназія н-р 7 у Беластоку), **Анна Грыгарук** (Гайнаўка), **Эдыта Русіновіч** (Орля); **II месцы: Юльянна Дораш** (Бельск), **Тамаш Таранта** (Бельск), **Аліцыя Міранчук** (Нарва), **Марк Качко** (Бельск); **I месцы: Кацярына Кузьміч** (Гарадок) — узнагарода Пасольства і Генконсульства РБ, **Ганна Мордань** (Бельск) — узнагарода дырэктара ГОК у Нараўцы, **Наталля Швед** (гімназія н-р 7 у Беластоку) — узнагарода дырэктара школы ў Нараўцы; **Гран-пры: АЛЯКСАНДРА ЛАЎРАНЮК** (Бельск) — узнагарода войта Нараўчанскай гміны.

Тэкст і фота Міра Лукша



Пятрусь Аўксянцюк

Як быць чалавекам

Фота РАІНЫ СТЭФАНЧУК

Студэнты Універсітэта ў Тэрэміскаx

Па дарозе з Гайнаўкі ў Белавежу ляжаць Тэрэміскі. Мала хто ведае, што ў гэтай невялікай вёсцы ёсць універсітэт. Вучыць ён будучых аніматараў грамадскага жыцця, паказвае, як жыць у шматкультурным і разнародным свеце. Гэта была мара Яцка Кураня.

Пяцігадовы універсітэт у Тэрэміскаx у канцы будучага акадэмічнага года выпусціць першы курс. Цяпер дванаццаць маладых людзей з усяе Польшчы займаецца на дзённых занятках на першым курсе ў былой драўлянай і адрамантаванай школе. Чарговыя курсы вучацца ў Варшаве-Ваўры. Там заняткі праводзяцца ў доме, дзе змяшчаецца таксама Фонд Яцка Кураня; раней тут была яго кватэра. Павел і Кацярына Вінярскія заснавалі школу разам з Данутай Курань. Было гэта ажыццяўленне ідэі хворага ўжо тады Яцка Кураня. У лісце кандыдатам, бацькам, настаўнікам і грамадскім дзеячам Данута Курань, старшыня Управы Адукацыйнага фонду яе мужа напісала: „Паўшэхны універсітэт імя Яна Юзафа Ліпскага ў Тэрэміскаx ствараюць людзі, якія паставілі перад сабой заданне знайсці адказ на пытанне як жыць, якім быць чалавекам — а гэта пытанне аб культуру, аб міжчалавечыя адносіны".

— Яцэк Курань меў моцны ўплыў на кшталт гэтай школы. Заснавальнікі абапіраліся між іншым на ідэях народных універсітэтаў, — расказвае Дарота, адна з каардынатарак рэалізаваных тут праектаў.

На адной з універсітэцкіх сцен вісяць здымкі Яцка Кураня. Пры адной з іх — камінок. На ім выпісана на лістку: „Пераходзь спакойна праз гоман і спех, і памятай, які супакой можна знайсці ў цішыні". Побач аўдыторыя з камп'ютэрамі, малая бібліятэка-пакой ціхай навукі. На спецыяльнай табліцы распіска цыклічных заняткаў: навука аб палітыцы, культура польскай мовы, прадпрымальнасць, *oikumene*... У куханьцы спіс вахт па дзве асобы: навуковая, хатняя, посудная, гатаванне, сервіроўкі, камандзіровачная і ўказанні, якое смецце можа трапіць да кожнага з дзевяці кашоў.

Кацярына Вінярская з-пад свайго дому і стадолы — заадно школьнай тэатральнай сцэны — некалькі дзесяткаў метраў далей — успамінае:

— Мы прыехалі да Адама Вайрака, які быў калегам з двара Паўла і сябраваў таксама з Яцкам. Казаў: тут ёсць пустая школа. Дануся Курань зараз заявіла, што калі б мела такую школу, дык адразу зрабіла б у ёй народны універсітэт. Адам задэкларава, што на адукацыйны праект для моладзі купіць нам гэтую школу.

Адам Вайрак, вядомы журналіст-натураліст жыве ў доме праз плот:

— Перадача школы Фонду гэта быў вынік майго сяброўства з Яцкам Куранем.

Праекты на практыцы

— Універсітэт гэта месца для людзей, якія хочуць дзейнічаць, для аніматараў, якія хочуць штосьці змяняць, — тлумачыць Кацярына Вінярская.

Агулам чатыры патокі гэта каля пяцідзесяці маладых людзей. Не ўлічваючы першага курса ў дванаццаць асоб, рашучых грамадскіх дзеячаў — каля дваццаткі.

— Штотыдзень праводзяцца цыклічныя заняткі, сярод гэтага шмат англійскай мовы. Асноўнымі заняткамі з'яўляецца грамадская анімацыя, падзеленая на тэарэтычную і практычную часткі, — тлумачыць Каміла з Алясніцы, другая з Даротай каардынатарка праектаў рэалізаваных школай.

Адзін з праектаў завяршыўся выданнем ілюстраванай архіўнымі здымкамі кніжкі „Opowieści z Czerewkowego Belwederu":

— Мы паўгода працавалі з вучнямі гімназіі ў Бельску-Падляшскім, дзе працуе клуб валанцёра. Маладыя людзі адтуль ездзяць у Дом грамадскай апекі ў Чараўках. Там у іх прышываныя бабулі і дзядулі. Слухаюць гісторыі іх жыцця, бывае, вельмі цяжкіх. Спісалі гэтыя гісторыі. Прытым былі заняткі па апрацоўцы здымкаў, вярстання тэкстаў. Іншы праект гэта закончаны нядаўна ў Гайнаўцы і Белавежы Фільмавы фестываль „Правы чалавека ў фільме".

На першым курсе вучацца людзі з усяе краіны. Шмат з паўднёвай Польшчы, хоць бы з Жывеччыны. З Падляшша няма нікога.

— Набор гэта наша вялікая праблема, — не скрывае Каміла. — Справа ў пошуках маладых людзей; галоўным чынам праз Агенцтва рэструктурызацыі і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі (АРіМСГ). Гэта не заўжды спраўна ідзе, бо дзесьці там нашы інфармацыі блакіруюцца чыноўнікамі. Таму сёлета нашы старэйшыя студэнты сядалі ў машыну і самі ездзілі па малых пасляпэгеэраўскіх вёсках. У прынцыпе адзінай катэгорыяй, каб быць сюды прынятым, з'яўляецца ангажаванасць і ахвота. Вядома, ёсць пэўныя абмежаванні. Прымаем людзей ва ўзросце 19-24 гадоў, у якіх няма шанцаў на адукацыю, значыць, з пасляпэгеэраўскіх вёсак і малых мясцовасцей ды з „блёкавішчаў" у вялікіх гарадах, „благіх кварталаў".

Адны з асноўных умоў жыцця і навукі ў Тэрэміскаx: абсалютная забарона курыць і піць алкаголь.

— Калі хтосьці не ў змозе справіцца са звычкай, то тут, пэўна, не вытрымае. Калі б студэнты прызначалі на цыгарэты свае грошы, якіх у іх у прынцыпе няма, гэта быў бы нейкі абсурд.

Студэнты Універсітэта імя Ліпскага з'яўляюцца стыпендыятамі Фонду. За навуку некаторых (з пасляпэгеэраўскіх вёсак) плаціць АРіМСГ.

Праграмна свабодныя

У Тэрэміскаx жыве каля сарака сем'яў. Універсітэт мае добрыя кантакты з мясцовымі. Каміла кажа:

— Поспех гэтых стасункаў вынікае з таго, што ўсё робім малымі крочкамі. Стараемся штосьці арганізаваць таксама для мясцовага насельніцтва, напрыклад, тэатральныя сустрэчы.

У сёлетнім акадэмічным годзе першы курс падрыхтаваў вечар польска-беларуска-ўкраінскага калядавання. Стадола Касі і Паўла Вінярскіх была запоўнена. Паявіліся таксама маладыя хлопцы, якія звычайна стаяць пад крамай і п'юць.

Універсітэт Ліпскага не дае дыпломаў. Каміла:

— Мы не з'яўляемся і не хочам быць фармальнай вучэльняй, бо гэта навязвае міністэрскія абмежаванні. Не маем экзаменаў, не ўлічваючы тэстаў па англійскай мове. Студэнты нават не мусяць рабіць на занятках занатовак.

Калі заглянем у заліковыя кніжкі студэнтаў першых курсаў, уражваюць прозвішчы выкладчыкаў: праф. Герэмэк, праф. Барташэўскі, праф. Бауман (рэктар Універсітэта ад смерці Яцка Кураня)...

Кацярына Вінярская:

— Адчуваем, што карыстаемся традыцыяй незалежнай, даваеннай адукацыі ў Польшчы. Хочам выдаваць, як гэта адбываецца цяпер у Еўрасаюзе, індывідуальныя адукацыйныя карты. Да таго і так кожны будзе мусіць сведчыць самім сабою, асабліва ў сітуацыі такой колькасці вышэйшых школ у Польшчы.

Студэнты могуць закончыць навуку пасля першага года ў Тэрэміскаx і выбраць іншыя вучэльні або працягваць навуку ва Універсітэце Ліпскага з сядзібай у Варшаве-Ваўры і там ангажавацца ў праекты Фонду Яцка Кураня, у дапамогу старэйшым людзям ці хоць бы ў арганізацыю канікул для бедных дзяцей.

Студэнтам баліць таксама гэты „вялікі свет". Павел Вінярскі ў лісце беларускай апазіцыі запрасіў ва Універсітэт у Тэрэміскаx двое студэнтаў выкінутых з беларускіх вучэльняў. Летась гасцявалі тут вучні з распушчанага мінскага Гуманітарнага ліцэя.

Нельга інакш

У рамках тэатральнай майстэрні Альжбеты Роек з Тэатральнага згуртавання „Chorea", заняткаў Кацярыны Вінярскай „Oikumene", прысвечаных шматкультурнасці, у мінулым семестры займаліся хрысціянствам (асабліва праваслаўем). Цяпер студэнты займаюцца яўрэйскай праблематыкай.

— Адна з найважнейшых спраў, каб збудаваць сваю тоеснасць, каб незалежна думаць і ўмець выбіраць, будаваць адкрытую паставу да свету і людзей — гуманітарная адукацыя, у якой агромную ролю адыгрывае свядомасць шматкультурнасці. У гэтым месцы, на шматкультурным Падляшшы, нельга думаць інакш, — перакананая ў гэтым Кацярына Вінярская.

Студэнты ездзяць на веласіпедныя экскурсіі ў Сейны да сяброў з Асяродка „Пагранічча". Штогод у Крынках дае ім лекцыі Сакрат Яновіч.

Студэнтка першага курса Мажэна з Янава-Падляшскага: — Хоць няма тут дыпломаў, замест сядзець дома і нічога не рабіць, маю волю быць тут. Мае бацькі не працуюць.

Іншая са студэнтак: — Аб школе я даведалася ад знаёмай. Заўжды, калі вяртаюся дадому, сумую па Тэрэміскаx...

Раіна Стэфанчук

Хацеў уцякаць на волю

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Успаміны Сцяпана БАРАНА з Вулькі-Нурэцкай, народжанага ў 1924 г.

У школу хадзіў я ў сваёй вёсцы. Вучыліся ў ёй дзеці з самой Вулькі-Нурэцкай, з хутароў і з Янцэвіч. Навучалі два настаўнікі і дзве настаўніцы; загадчыкам быў Пахля з Любліна. Па суботах было тры прадметныя гадзіны і гадзіна рэлігіі, на якую штотыднёва прыязджаў бацюшка з Зубач. Католікаў было ў нас мала, шасцярых, і ксёндз да іх у школу не прыязджаў.

Навуку ў школе закончыў я год ці два да вайны. Астаўся гаспадарыць з бацькамі. Сеялі жыта, грэчку, лубін і авёс, садзілі бульбу, бо зямля была слабая. Лепшы ўчастак быў каля рэчкі і там быў наш агарод. Поля было ў нас малавата і стаў я дарабляць пасвіўшы кароў у суседа, які быў крыху багацейшы за нас і ў яго не было каму пасвіць дабытку. У вёсцы пасвіў не толькі я; плацілі метр жыта ад адной каровы за лета.

У 1939 годзе саветы з'явіліся ў Вульку-Нурэцкую на Прачысту. Віталі іх нашы партыйцы са сцягамі. Савецкае войска заняло маёнтак у Янцэвічах, з якога ў 1940 годзе выбралася на вайну з фінамі. Адтуль салдаты ў нашу вёску з'яўляліся па дровы або па гарэлку; нашы куплялі гарэлку па 8 рублёў у Брэсце, а прадавалі ваякам па 15 рублёў. І да дзяўчат, калі ўдавалася, вырываліся салдаты. Адзін паліт-рук, Бубноў, прыходзіў да нашай польскай настаўніцы, якой мужа забралі на фронт і не было пра яго вестак. У 1940 годзе ён ёй аформіў дакуметны і яна выехала за Буг; сама была ад Кракава. Нашых ваякі запрашалі ў кіно, якое паказвалі ў маёнтку. Уласніка маёнтка саветы вывезлі і ён ужо не вярнуўся. Ад нас, з вёскі, саветы нікога не вывезлі, толькі намаўлялі ў калгас, але ніхто не запісаўся.

За Вулькай-Нурэцкай, у напрамку Тымянкі, саветы сталі ў 1940 годзе будаваць аэрадром. У рабочай брыгадзе было шэсцьдзесят-восемдзесят чалавек. Зямлю нівеліравалі машынамі. І мясцовыя людзі фурманкамі вазілі зямлю, за грошы. Той аэрадром будавалі да самай вайны, але збудаваць не ўспелі. І калі вайна ўспыхнула, то ўсе паўцякалі, усё пакідалі, хаця іх не бамбілі.

Немцы бамбілі Чаромху, а пасля нашы людзі разбіралі са станцыі што папала: пшаніцу, папяросы, рыбу, адзежу, абутак. Я таксама хадзіў, узяў папяросаў і шкуру на боты. Спынілася гэта, калі немец стаў страляць. Забіў некалькі чалавек, у тым ліку майго калегу Івана Лукашука куля смяротна параніла ў жывот; аднаму з нашых ранілі каня.

На працу ў Германію мяне вызначылі адным з першых; бралі спярша тых, дзе ў хаце было трох мужчын. Паехаў я ў гміну, у Высокае, адтуль на другі дзень сабралі нас у вагоны і ў Бельск завезлі; там каля ратушы зборны пункт быў. У Бельску патрымалі хіба суткі, загрузілі ў вагоны і адправілі ў Прусію. З Вулькі ехала тады адна дзяўчына і яшчэ двух хлопцаў. Мы, хлопцы, за Бельскам выскачылі з поезда, а дзяўчына паехала. Дахаты вярнуліся пяшком.

Пасля месяца зноў бяруць у Германію. Зноў Высокае, зноў Бельск, лазня, поезд. І я яшчэ ў Бельску з поезда ўцёк. І зноў пяшком, сам адзін, вярнуўся дахаты. І трэці раз таксама ўцёк. Вызначылі групку па ваду; я каля ратушы адышоў на тратуар і ў сваю дарогу. І чацвёрты раз уцёк бы з Бельска, але калега баяўся, гаварыў, што тут сям'ю паб'юць.

12 лютага 1943 года завезлі нас у Ангербург (цяпер Вэнгажэва), вывелі з поезда, а купцы паразбіралі нас. Я трапіў у мясцовасць Альбрэхтвізэ да баўэра Мураха, мо пятнаццаць кіламетраў за Ангербургам. Працаваў на полі — гной, бульба. Было нас пяцерых, жылі ў асобным доме; адзін быў ад Пружан і траіх было ад Гайнаўкі: з Асоўкі, Койлаў і Тыневіч.

Кармілі кепска, сырую бручку елі. У нядзелю не працавалі і тады можна было хадзіць на возера, да сяброў.

Недзе ў красавіку-маі я ўцёк адтуль са Сцёпам Свентахоўскім з Тыневіч. Ішлі ноччу, праз лес, кіраваліся зоркамі. Пасля двух дзён, калі дайшлі да польскай граніцы, нас злавілі.

Адседзелі мы некалькі месяцаў у турме ў Алецку і летам скіравалі нас у іншы маёнтак. Там працаваў у полі, кармілі добра і кватаравалі нармальна.

У той час набіралі рабочых у шахты на Шлёнск. Гаспадар вызначыў мяне, сказаў:

— Ты ўцякаў у Польшчу, то цяпер туды сам едзь.

Паехаў толькі я, а Свентахоўскі астаўся. Ехаў цэлы транспарт хлопцаў з Прусіі, прымусовых работнікаў. Завезлі нас у горад Імелін за Катавіцамі. Зразу бралі да лекара, каб вызначыў, каго можна ў капальню, а каго не; мяне назначылі ў капальню.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Крыху парабіў у шахце і зноў уцёк, гэтым разам з Сяргеем Кульгаўчуком ад Пружан. Ішлі пяшком, злавілі нас каля Олькуша. Патрымалі двое сутак і адправілі ў Асвенцім.

У канцлагер завезлі нас поездам жандары. Пасялілі нас у блоку н-р 3, мне на руцэ вытатуіравалі нумар „149406". Працавалі галоўным чынам у полі, выконвалі таксама іншыя работы. Спалі на трох'ярусных ложках. На суткі давалі 20 дэкаграмаў хлеба, адзін літр кавы на двух і ў абед літр супу, такога, што і сабака не еў бы. У канцлагеры быў я паўтара года, ад 7 верасня 1943 да 20 студзеня 1945 года.

Перад фронтам немцы паўцякалі ноччу. Рана ўстаем, а тут ужо рускія. Зразу зрабілі медыцынскі агляд, кармілі асцярожна, абыходзіліся з намі вельмі добра. Жылі далей там, дзе і раней.

Даводзілі нас да сіл каля двух тыдняў. Тады палякаў адпусцілі дадому, а нас, беларусаў, забралі ў армію, у пяхоту; Кульгаўчук быў разам са мною. Мо з два тыдні абучалі: стралялі, акопы капалі, маршаў мала было. І на фронт, „на защиту Родины".

15 сакавіка, у час баёў на Одры, мяне раніў у лытку асколак з мінамётнага снарада. Санітар перавязаў, калега паволі завёў у санчасць. Адтуль трапіў у шпіталь у Аполі, там мяне аперыравалі, вынялі асколак. Са шпіталя выпісалі мяне 12 мая і адправілі назад у сваю часць: 3-ю роту 3-га батальёна 22-га палка 92-й дывізіі, якая стаяла ў казармах у Клодзку.

У ліпені вывелі нас у Аўстрыю; ішлі пяшком, праз Брно, аж у Альпы. Нага мая зажыла ды і так ніхто нікога не шкадаваў. Стаялі ў казармах, а пасля наш полк вывезлі поездам у Венгрыю, у горад Печ, на поўдні, бо там венгры нападалі на савецкую камендатуру. Там таксама закватаравалі ў казармах; кармілі не занадта.

У Печы стаялі мы каля паўгода; нашу часць з Аўстрыі перапраўлялі на Украіну, у Сумы. Я трапіў у 2-ю батарэю баявога забеспячэння Сумскага артылерыйскага вучылішча імя Фрунзе. 12 лютага 1947 года мяне звольнілі з арміі.

Прыехаў я на граніцу, а мяне не прапускаюць. Вярнуўся я ў Мінск, у „Дом правительства", далі мне дакумент і я прыехаў у Ласосна каля Гродна, у зборны пункт. Там чакалі ўсе дэмабілізаваныя каб вярнуцца ў Польшчу. Ніякіх заняткаў не было, жылі ў бараках, харчаваліся ў вайсковай кухні. Некалькі месяцаў там быў, прапускалі па вагоне, а мы чакаем і чакаем.

Адзін перайшоў граніцу незаўважаны, заблудзіўся і вярнуўся зноў у Ласосна. Тут яго на допыты ўзялі, пыталі, дзе перайшоў граніцу, але адступілі ад пакарання. То я і яшчэ трох нашых хлопцаў ад Бельска ў тым самым месцы таксама тайком перайшлі граніцу і пяшком прыйшлі дахаты. Было гэта 7 чэрвеня 1947 года; ніхто ўжо больш да мяне не чапляўся.

Пасля я па Польшчы па работах ездзіў. Працаваў сезонна, летам, а на зіму вяртаўся дадому. Будаваў Варшаву, рабіў у Бытаме, але пабачыць тыя мясціны, адкуль уцякаў з прымусовай працы, не наведваўся. З мясцовым калгасам, у Вульцы-Нурэцкай, не меў дачынення.

А ў наш калгас заахвочвалі, забіралі яму найлепшую зямлю, найлепшыя сенажаці. Пабудавалі тут аборы, свінарні, склады, усё. А пасля калгас распаўся і цяпер ад таго адны рэбры асталіся, як на вайне.

Калгасаў у нас баяліся, бо і я гаварыў пра тое што сам бачыў, як на Украіне ў калгасах было цяжка жыць. За дзень працы давалі там па 10 дэкаграмаў жыта, пшаніцы, ячменю і аўса на аднаго чалавека. Дзецям у школу вараную бульбу загортвалі ў сумкі. На Пакрову ў калгасе каля Сумаў яшчэ проса ў полі стаяла. Не было каму рабіць. Мужчын не было, павыбівалі або былі толькі калекія; самыя жанчыны рабілі ў калгасе.

А я пасля астаўся на гаспадарцы. Малая яна была, і зямля слабая. Бо лепшую зямлю былі забралі пад калгас, а нам дзялілі горшую.

Запісаў Аляксандр Вярбіцкі

Найбольш цікавым падаецца шпацыр па гістарычнай дарожцы. Першая падрубрыка — „История создания и этапы исторического пути органов...

http://kgb.by

Доўг, гонар, айчына — гэтыя лозунгі з выявамі, адпаведна: навічка, генерала і лейтэнанткі, вітаюць рускамоўнага наведвальніка старонкі http://kgb.by Камітэта дзяржаўнай бяспекі Беларусі. У экскурсію па гэтай установе можна выбрацца па руска-, беларуска- і англамоўнай дарожках.

Англамоўнаму наведвальніку прапануюцца толькі гадзіны працы прыёмнай галоўнага офіса ўстановы. У беларускамоўнай версіі ёсць паведамленне: „Прыём грамадзян у КДБ, ва ўпраўленнях КДБ па абласцях, упраўленні ваеннай контрразведкі КДБ адбываецца кругласутачна ў прыёмных адпаведных органаў дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь. (...) У гарадскіх і раённых падраздзяленнях упраўленняў КДБ па абласцях, аддзелах ваеннай контрразведкі, арганізацыях, якія падпарадкоўваюцца органам дзяржаўнай бяспекі, прыём грамадзян адбываецца ў працоўны час у спецыяльна адведзеных пакоях ці кабінетах кіраўнікоў"; ці гэта прыём на працу, ці толькі збор інфармацыі — не ўдакладнена. І здымак галоўнага будынка гэтай установы. Да таго ж яго адрас і прозвішча старшыні, якім цяпер генерал-лейтэнант Сухарэнка Сцяпан Мікалаевіч. Выйсці ў рубрыкі — рускамоўныя.

Наведвальніку прапануюцца шэсць напрамкаў: нарматыўныя акты, структура, КГБ і прэса, гісторыя, кантактная інфармацыя і фотаальбом. Найбольш цікавым падаецца шпацыр па гістарычнай дарожцы, дзе тры падрубрыкі. Першая — „История создания и этапы исторического пути органов государственной безопасности Беларуси" з'яўляецца прамым штампам класічнай савецкай рыторыкі. Больш цікавая другая падрубрыка: „Краткая биография руководителей органов государственной безопасности Беларуси". Варта гэтыя біяграфіі вывучыць больш дэталёва. Першым згадваецца Віктар Яркін (на пасадзе ў 1918-1919 гг.), рускі па нацыянальнасці (народжаны ў 1889 і расстраляны ў 1937 годзе). Аляксандр Ротэнберг (1920-1921), яўрэй (нар. у 1886 г., пасля 1939 года весткі пра яго абрываюцца). Ян Ольскі (1921-1923), паляк (1898-1937). Станіслаў Пінталь (1923-1924), паляк (1894-1937). Філіп Мядзведзь (1924-1925), беларус (1890-1937). Раман Піляр (1925-1929), нацыянальнасць не згадваецца, народжаны ў 1894 годзе ў Вільні або пад Ломжай, расстраляны ў 1937 годзе. Грыгорый Рапапорт (1929-1931), яўрэй (1890-1938). Станіслаў Рэдэнс (1931), паляк (1892-1940). Герман Матсан (1931-1932), латыш (1896-1938). Леанід Закоўскі (1932-1934), латыш (1894-1938). Ізраіль Ляплеўскі (1934-1936), яўрэй (1894-1938). Георгій Малчаноў (1936-1937), рускі (1897-1937). Барыс Берман (1937-1938), яўрэй (1901-1939). Аляксей Наседкін (1938), рускі (1897-1940). Лаўрэнцій Цанава (1938-1941 і 1943-1951), грузін, нар. у 1900 г., памёр у Бутырскай турме ў 1955 годзе. Наступных загадчыкаў беларускага КГБ не прымушалі ўміраць. Былі гэта: рускі Міхаіл Баскакоў (1952-1954), рускі Аляксандр Перапеліцын (1954-1959), рускі Васілій Пятроў (1959-1970), рускі Якаў Нікулкін (1970-1980), рускі Веніямін Балуеў (1980-1990), беларусы Эдуард Шыркоўскі (1990-1994), Генадзь Лавіцкі (1994), Уладзімір Ягораў (1994-1995), Уладзімір Мацкевіч (1995-2000), рускі Леанід Ерын (2000-2004) і з 2005 года беларус Сцяпан Сухарэнка.

КДБ Беларусі, гэта „люди незаурядные, с богатой и чуткой душой, беззаветно служившие Родине и боровшиеся за светлое будущее страны".

Аляксандр Вярбіцкі

У Беларусі пяцібор'е пачалі развіваць у сярэдзіне 1950-х гадоў. Апошнія 10-15 год прадстаўнікі Беларусі сістэмна прэтэндуюць на п'едэстальныя месцы...

Беларусь, беларусы...

Атлеты пяці якасцей

Сучаснае пяцібор'е — гэта комплексны від спорту, які заключае ў сабе пяць самастойных відаў: фехтаванне, плаванне, кулявая стральба, крос (ці, іншымі словамі, бег па мясцовасці) і конная язда. Гісторыя гэтай змешанай дысцыпліны зазнала істотную эвалюцыю, змяняўся набор відаў, іх параметры, спосаб вызначэння мацнейшых удзельнікаў. Сённяшнія спаборніцтвы па пентатлону (іншая назва пяцібор'я) патрабуюць значных фізічных высілкаў і часу, таму зазвычай яны адбываюцца цягам трох-чатырох дзён. Плаванне і стральба праводзяцца ў першы дзень, скачкі на кані праз перашкоды могуць займаць і два дні. Прычым, пяціборцы заўсёды выступаюць на розных конях, якіх прадастаўляюць арганізатары і якія вызначаюцца лёсаваннем. Сістэма налічэння пунктаў за кожны від даволі складаная, а максімальна за асобную намінацыю можна набраць больш тысячы балаў, агулам звыш пяці з паловай тысяч. Натуральна, што спартоўцы маюць па некалькі трэнераў з-за істотнай розніцы паміж відамі, а рыхтоўля патрабуе універсальнасці.

У праграме алімпійскіх гульняў пяцібор'е з 1912 года, чэмпіянаты свету праходзяць штогод, пачынаючы з 1949 года. З 1970-х гадоў да ўдзелу ў гэтым відзе афіцыйна былі дапушчаны жанчыны. Сучаснае пяцібор'е — рэдкі госць на тэлевізійных экранах. А найбольшую папулярнасць пентатлон мае ў Еўропе. На міжнароднай арэне акрамя краін з захаду кантынента і ЗША дамінуюць прадстаўнікі Усходняй Еўропы — Балгарыя, Венгрыя, Беларусь, Польшча, Расія, Румынія.

У Беларусі пяцібор'е пачалі развіваць у сярэдзіне 1950-х гадоў. Апошнія 10-15 год прадстаўнікі нашай краіны сістэмна прэтэндуюць на п'едэстальныя месцы. Найбольшага поспеху дасягнуў Павел Доўгаль. Ураджэнец Мінска стаў бронзавым прызёрам сіднейскай алімпіяды (2000) у асабістым заліку. Мужчынская зборная Беларусі ў 2004 годзе стала пераможцам чэмпіянату Еўропы. У яе складзе выступалі Аляксандр Бысаў, Ягор Лапо, Дзмітрый Мелях. А летась нашы хлопцы заваявалі бронзавыя медалі.

З жанчын варта прыгадаць Жану Шубянок. Яна мае хіба найбольшы спіс перамогаў і прызавых месцаў на буйнейшых спаборніцтвах. Ураджэнка мястэчка Касцюковічы, што на Гомельшчыне, двойчы была срэбнай прызёркай чэмпіянатаў свету, а ў 1996 годзе дасягнула чэмпіёнскага індывідуальнага тытулу. У яе калекцыі таксама па два залатыя медалі першынства Еўропы ў камандавым і асабістым заліку, процьма іншых узнагарод. Паспяхова выступала і Інэса Шухаўцова, якая была чэмпіёнкай свету ў камандавым заліку ў 1987 годзе, выступаючы за СССР. Цяпер мацнейшай айчыннай пяціборкай з'яўляецца мінчанка Тацяна Мазуркевіч, якая яшчэ не дасягнула піку кар'еры, але ўжо мае шэраг прэстыжных заваёваў. Летась на спартовым небасхіле з'явілася яшчэ адна ўзыходная зорачка — Анастасія Самусевіч са Слуцка.

Лідэр беларускай мужчынскай дружыны — цяпер Дзмітрый Мелях. На афінскай алімпіядзе ён заняў высокае 5-е месца. Свой клас ён пацвердзіў на мінулым тыдні, калі выйграў другі этап Кубка свету, апярэдзіўшы ўсіх фіналістаў, якіх было 32. А вось Тацяна Мазуркевіч упала з наравістага каня і не здолела завяршыць спаборніцтваў. Пяцібор'е сапраўды вымагае не толькі выяўлення розных атлетычных якасцей, але і шанцавання.

Уладзімір Хільманові

Сусветная вядомасць

У невялічкім пакойчыку, які больш нагадвае цесную келлю манаха-адзінотніка з наўмысна малым метражом, узятым адмыслова для здзеку над сваім зямным абліччам, каб чалавек не мог ні легчы, выцягнуўшы ногі, ні сесці, галавой не ўпёршыся ў столь, праводзілі сход каля трох дзесяткаў апазіцыянераў. Спрэчкі, як і ў бальшыні разоў, былі пустымі як кішэні гулякі і ніякіх сур'ёзных тэмаў не падымалі. На тое было безліч прычын. І зацеснае, як дзявочыя джынсы, памяшканне, і мажлівае з боку дзяржаўных спецслужбаў праслухоўванне, і завялікая для сур'ёзных размоў колькасць людзей. А не разыходзіліся таму, што некаторыя кіраўнікі яшчэ не паспелі сказаць усе глупствы, якія засталіся ў іх галовах з апошняе сустрэчы, а іншыя яшчэ не задаволілі свае хворыя амбіцыі агідным пазаваннем перад добраахвотнымі падначаленымі.

— І не хвалюйцеся. Як пойдуць праследы, то дапаможам усім. Мы ўсё ж вядомыя па ўсім свеце людзі і таму грамадства на наш заклік адгукнецца, — агучваючы чарговую неабдуманую ідэю, якая толькі што прыйшла ў галаву, заявіў Сымон. — Мы ў дзень выбараў выведзем на вуліцы нашага горада дзесяць тысяч чалавек. Калі іх затрымаюць, то выведзем сто тысяч.

— А калі затрымаюць сто тысяч, то выведзем сто мільёнаў, — не вытрымаўшы ўсёй бяздумнасці і нерэальнасці сцвярджэння, здзекліва і саркастычна зарагатаў Віталь. — Толькі вось у нашым горадзе жыве нашмат менш грамадзян, чым наша кіраўніцтва плануе вывесці на вуліцу. А ўсю нашу шматколькасную апазіцыю міліцыя закіне ў адну машыну і яшчэ там месца застанецца для выпадкова прыйшоўшых і свядома прыехаўшых. А можа мы чаго не ведаем? Можа нашы кіраўнікі, пасля ганебных паразаў на мясцовых выбарах год таму, часу дарма не гублялі і зараз, перад прэзідэнцкімі выбарамі, плануецца вялікае падвышэнне нараджальнасці?

— Я табе слова не даваў, — рэзка перабіў яго Сымон. — Мы не можам мець поспеху, калі будуць хоць якія сумненні. Калі хтосьці пачынае лічыць колькі месцаў ёсць у міліцэйскіх машынах і камерах затрымання, то ўсялякая агітацыя — справа безнадзейная. Усе намаганні тады рассыпаюцца як попел пасля пажару, а дух змагання падымае рукі ўгору.

— Такія жудасці адбываюцца тады, калі кіраўнікі апазіцыі нясуць больш бязглуздзіцы, чым трэці Напалеон з сёмай палаты дзевятай рэспубліканскай лякарні шалёных вар'ятаў і псіхічна хворых філосафаў. Заўсёды трэба казаць толькі праўду. Тады людзі будуць ведаць куды яны ідуць, навошта, і чым гэта скончыцца, — парыраваў Віталь. — Толькі тады можна спадзявацца на поспех, калі не падманам, а свядома людзі выйдуць на вуліцу і, не чакаючы нейкай дапамогі, самі перастануць баяцца. А пра свае сувязі і мажлівасці, бо ты нібыта вядомы як дацкі прынц разам з бедным Ёрыкам, можаш расказаць глухой прыдзіцянелай бабульцы, якую ўнукі кожную раніцу вывозяць пакатаць на крэсле па глухой вуліцы. Вось будзе табе радасці. Бо тая бабулька, што б ёй не сказаў, на ўсё ў знак згоды махае галавой.

— Ды мяне ўвесь свет ведае, — разлаваўшыся, ускочыў на ногі Сымон, праверыўшы пры гэтым на трываласць галавой столь. — Пра мяне ўвесь Інтэрнэт піша. У мяне штодзённа бяруць каментарыі журналісты...

— Можа і бяруць, — праверыў трываласць столі з другога боку памяшкання Віталь. — Можа нават і пішуць што. Толькі ці хто тое чытае.

Каб не ўмяшанне прысутных, якія так да канца і не вызначыліся на чыім баку праўда, на трываласць, акрамя столі, прайшлі б праверку дзверы, адзінае маленькае акно і чатыры змрочныя сцяны маленькага памяшкання. І наўрад ці вытрымалі б ад аргументаў сяброўскай спрэчкі двух апазіцыйных змагароў. Сымона яна так закранула, што цэлую ноч не мог заснуць. Ён жа такі вядомы. Нават усе замежныя палітыкі, што прыязджаюць на Беларусь, вітаюцца з ім за руку. А тут такое сказалі...

— Сёння дзень выбараў, не забылася, — прывітаўся зранку ён з жонкай, так і не адышоўшы ад вячэрняй спрэчкі. — Сёння ў нас несанкцыянаванае мерапрыемства. Мяне можа забраць міліцыя...

— Ой, ды каму ты патрэбны, — адгукнулася з кухні жонка, варочаючы нешта ў патэльні і вуркочачы сабе пад нос нейкі музычны матыўчык.

— Як гэта каму, — Сымон зайшоў на кухню і глянуў жонцы ў вочы. — Я ж вядомы палітык, апазіцыянер у таталітарнай краіне, кіраўнік небяспечнай для гэтага рэжыму партыйнай структуры...

— Ты?! — здзіўлена глянула на яго жонка, не перастаючы варкатаць. — Сапраўды? Х-м. Хто б мог падумаць.

Генрых Западашмянскі

Нашы назвы ў Арлянскай гміне

Не часта задумоўваемся, з чаго ўзялася назва нашай мясцовасці, хаця яна істотная, бо звязана з яе характарам, з яе мінулым.

Паходжанне назвы мястэчка Орля канчаткова не высветлена. У паўсядзённым карыстанні гавораць пра яе *Вуорля*. Адны даказваюць, што назва мясцовасці выводзіцца ад назвы ракі Арлянкі, якая працякае праз заходнюю яе частку. Далей, у Арлянку ўліваецца рачулка Орля. Гэты, невялікі сёння, ручаёк мог у даўнасці даць пачатак назве мясцовасці. Іншыя сцвярджаюць, што да замацавання назвы мясцовасці ў рашучай меры прычыніліся арлы, якія калісьці вяліся ў аграмадных лясах за гэтым гарадком. Гэтае меркаванне падмацоўвае і герб Орлі: чорны арол з тапаром у правай назе на чырвоным фоне, які прысвоіў мястэчку 15 мая 1643 года ягоны тадышні ўладальнік Януш Радзівіл.

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Рака Арлянка

Выпадковыя артэфакты (каменныя сякеры і малаткі, гліняныя урны з попелам) паказваюць на дагістарычнае паходжанне пасёлка. З гістарычных крыніц вядома, што Орля належыць да ліку вельмі даўніх паселішчаў.

Кашалі (у даўніх запісках паяўляецца і назва Катэлі), паводле выказванняў колішніх яўрэяў, узнікілі шэсцьдзесят гадоў раней за Орлю. Гэта пацвярджае архіўны запіс, што ў 1507 годзе Яська Івановіч атрымаў ад караля пасаду войта з правам заснавання горада, дзеля чаго атрымаў Катэлі, Вэрвечкі і Тапчыкальскі лес.

Назва Кашалі таксама не мае адназначнага паходжання; магчыма, выводзіцца яна з цюркскага слова *кош*, якім называлі ваенны лагер, або ад назвы ўжываных калісь пастушых торбаў. Найбольш верагодны першы варыянт. У даўні час кашалёўскія землі былі падзелены жэрабем паміж першых пасяленцаў, а вёска стаяла кашом — лагерам.

Крывятычы раней называліся Крываволяй і былі заселены асочнікамі, якія сачылі за лясной звярынай і пільнавалі панскага лесу.

Шарні, раней Сэрні — паходжанне назвы не высветлена.

Некаторыя вёскі, што ў Арлянскай гміне, былі свабоднымі каралеўскімі і займаліся вытворчасцю або выконвалі назначаныя абавязкі для патрэб войска.

У Кошках выконвалі калісь **кашы** з лазы і саломы для захоўвання збожжа.

У Градалях рыхтавалі бярвенні для гарадзьбы гарадзішчаў (па-старославянску **град**, па-польску **gród**). Магчыма, што назва Градалі выводзіцца і ад прозвішча млынара Філіпа Грэдэля (Рэдэля), які ў другой палове XV стагоддзя атрымаў немалы надзел зямлі ў Бельскім старостве паабапал ракі Белай, якую перагарадзіў грэбляй і пабудаваў там млын.

Спічкі, раней Спыжкі, дастаўлялі ў замак **спіжу** (ад нямецкага слова *Speise*), спажыву.

Жыхары Тапчыкал здабывалі і **тапілі** руду.

Паходжанне назвы вёскі Тапаркі, раней Тапарова, да канца не высветленае. Верагодна паходзіць яна ад заснавальніка або першага яе ўладальніка. У 1540 годзе Орля шляхам сямейных эвалюцый стала ўласнасцю буйнага малапольскага рода Тэнчынскіх герба **Тапор** (адгэтуль і выява тапара ў гербе мястэчка). У Тапарках, магчыма, жыло многа кавалёў, якія выраблялі сечныя прылады, сякеры.

Этымалогія назвы Рудуты, раней Рудолты, не высветлена. Аднак сумнявальна, што выводзіцца яна ад заснавальніка ці жыхара па прозвішчы Рудолт. Найбольш верагодна назва вёскі выводзіцца ад **руд** і балотністых **рудных** лугоў. У зямлі навокал ракі Арлянкі, што цячэ побач вёскі, і на яе дне трапляецца многа кавалкаў руды. Калісь людзі з дзярновай руды выплаўлялі жалеза. Суседняя мясцовасць называецца Руткай і жыхары Рудутаў па сённяшні дзень называюць суседзяў руднікамі.

Назва вёскі Шчыты выводзіцца, верагодна, ад яе ўладальніка, бо ў 1520 годзе яна належала баярскаму роду Шчытовічаў.

У Міклашах быў даўней фальварак Міклашэва. У дакуменце ад 1586 года згадваецца пра Міклашы „villa bojarorum Miklaszewszczyzna".

Зараз у Арлянскай гміне пад трыццаць усіх населеных пунктаў — вёсак і калёній. У пачатку XIX стагоддзя розныя эпідэміі рабілі спусташэнне тагачаснага насельніцтва і здаралася, што такім чынам знікалі амаль цэлыя вёскі. У 1827 годзе эпідэмія крывавага паносу ахапіла Тапчыкалы, Рудуты, Кашалі, Шарні і Бараноўцы. У палове XIX стагоддзя ў выніку эпідэміі халеры перастала існаваць вялікая вёска Вэрвечка, якая налічвала 82 гаспадаркі і распасціралася ад сённяшняга хутара Антанова на правым беразе Арлянкі да арлянскіх праваслаўных могілак. Асталося толькі некалькіх гаспадароў, якіх уладальнік Орлі перасяліў у Вульку і Міклашы.

Некаторыя вёскі мянялі свае назвы, некаторыя маюць па дзве (так, напр., Маліннікі на дарожных знаках называліся Маленнікамі). Знаёмства з назвамі вёсак можа падказаць шлях да пазнання народнай культуры, каб пазнаць рычагі, якія кіравалі грамадскім жыццём.

Міхал Мінцэвіч

Яшчэ пра польска-беларускую палітыку

У 13 н-ры „Нівы" быў змешчаны артыкул Мацея Халадоўскага п.з. „Бел-чырвона-белая Польшча", у якім былі выказаны, між іншым, мае меркаванні, для Беластоцкага тэлебачання, наконт адносін нашай краіны да рэжыму Лукашэнкі. Цытую: „Я адчуваю неспакой, што нашы ўлады занадта там умешваюцца". Тут хачу сказаць праўду, што Беластоцкае тэлебачанне не паказала ўсяго таго, што я сказаў перад тэлекамерай, не выявіла майго імя, прозвішча ды адрасу, што перашкаджала Мацею Халадоўскаму, і ён выявіў мае даныя на старонках „Нівы", за што я пакрыўдзіўся на яго. Але ж з-за гэтага не буду спыняць супрацоўніцтва з „Нівай". Таксама на старонках „Нівы" скажу, што нашы ўлады замнога ўмешваюцца ў справы Беларусі. Не глядзяць на зло, якое дзеецца ў нашай дзяржаве, а абмяжоўваюць правы чалавека — усе ўстановы хочуць узяць пад сваю кантроль, на чале з дзяржаўным тэлебачаннем і прэсай, каб ніхто не мог іх крытыкаваць.

Таксама трэба сказаць праўду, што тыя Гертыхі, Дорны, Качынскія, Квасневскія, Калішы, Міллеры, Лепэры, Каліноўскія і Паўлякі вучыліся пры камуне, і адукацыя іх дармовай была. А цяпер дзеці работнікаў ды сялян не маюць магчымасці паступіць на дзённыя студыі, толькі на завочныя, за якія трэба многа плаціць. Не пойдуць вышэй вучыцца таксама дзеці беспрацоўных ды з мнагадзетных сем'яў, бо яны не маюць грошай каб годна пражыць, а пра навуку няма што і ўспамінаць. Цяпер дзеці беднякоў працуюць „парабкамі" ў багатых баўэраў, якія за цяжкую сельскагаспадарчую працу плацяць ім па 3 зл. за гадзіну. Ведаюць гэта паны Лепэр ды Каліноўскі і многа іншых паслоў, якія вядуць уласныя сельскія гаспадаркі або іншую сельскагаспадарчую дзейнасць.

Другая справа, якой зацікаўлены нашы ўлады, гэта камуністычныя злачынствы, якія адбываліся ў г.зв. рэакцыйным падполлі і якія не падлягаюць пратэрмінаванню. Цяпер яны падрабязна вышукваюцца, каб знайсці віноўнікаў і асудзіць іх. А што рэакцыйнае падполле расстраляла праваслаўных фурманоў, то нават памятную дошку на брацкай магіле на бельскіх могілках улады не дазвалялі ўстанавіць такую, якую хацелі сем'і памардаваных. А колькі ў нас сем'яў, якія па сённяшні дзень не могуць устанавіць месца пахавання сваіх родных. А былі сярод іх вайскоўцы, міліцыянеры, працаўнікі бяспекі, прадстаўнікі тадышніх гмінных ды павятовых улад, члены ПАРП. Пра гэта не ўспамінаюць цяперашнія ўлады ды не хочуць, каб з кніг гісторыі прапалі белыя плямы. Я напісаў быў калісь верш, які дасюль не друкаваўся:

Дзе магіла яго?
Не магу я знайсці,
І нідзе не магу дапытацца!
Каб хоць раз туды зайсці,
Пасвяціці зямлю,
Каб святар хоць разок памаліўся.
І бярозавы крыж
Я паставіць хачу.
Брат — салдатам тады называўся.

Мікалай Лук'янюк

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Nakład: 1 700 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2006 r. upływa 5 czerwca 2006 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na III kwartał 2006 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 45,50 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwar. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Połud. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

„Даўціпы"

Андрэя Гаўрылюка

Бандыт-пачатковец прыходзіць у краму купіць пісталет.

— На колькі патронаў хочаце? — пытае прадавец.

Пакупнік хапае мабільнік:

— Банк? Скажыце, колькі ў вас персаналу?

* * *

Між сяброўак:

— Валя, ці ты прызналася нарачонаму, колькі ў сапраўднасці маеш гадоў?

— Вядома, але да канца яшчэ не даказала.

* * *

Паляк, немец і рускі хваляцца, хто вырабляе найбольшыя самалёты:

— Мы, — кажа немец, — робім такія самалёты, у якіх футбольная каманда, што ляціць на матч, трэніруецца ў час палёту.

— Мы, — кажа рускі, — выпускаем такія самалёты, што калі войска едзе на вучэнні, яно ўжо ў самалёце адбывае манеўры.

— А я, — кажа паляк, — раскажу вам падзею, якая здарылася ў польскім самалёце. Капітан машыны глянуў на пульт і сцвердзіў, што пашкоджаны нейкія механізмы. Загадаў ён бортмеханіку ўзяць „малюха" і праверыць правае крыло; вярнуўся ён пасля гадзіны, але пашкоджання не знайшоў. Тады капітан сам сеў у „паланез" і паехаў пабачыць, што ў хвасце машыны. Вярнуўся пасля дзвюх гадзін...

— І што? — пытаюць нецярпліва рускі з немцам.

— Сцвердзіў, што нейкі дурань не закрыў акна і ў сярэдзіну ўляцелі два самалёты: рускі і нямецкі.

* * *

Камера смерці ў амерыканскай турме. Злачынца сядзіць на электрычным крэсле. Пракурорка, якая абавязана прысутнічаць у час экзекуцыі, пытае асуджанага:

— Якое ваша апошняе пажаданне?

— Каб вы селі мне на калені.

* * *

— Мамачка, — пытае малы сынок, — чаму ўсе казкі пачынаюцца са слоў „Жыла-была..."?

— Маё дзіцятка, — адказвае маці, — некаторыя казкі пачынаюцца са слоў „Сёння вечарам маю важную канферэнцыю".

* * *

У булачнай краме:

— Ці ёсць сённяшні хлеб?

— Няма.

— А калі будзе?

— Сённяшні будзе заўтра.

* * *

Прыходзіць мужык да лекара:

— Пан доктар, не ведаю, што са мною дзеецца: калі кахаюся з жонкай, то мне раз холадна, а раз горача...

Лекар ніколі не чуў пра такі выпадак і папрасіў прывесці ў кабінет жонку.

— Ці ўмела б пані, — пытае яе, — патлумачыць гэтую з'яву, што мужу раз холадна, а раз горача.

— Гэта проста: ён практыкуецца два разы.

— Якім чынам два разы?

— У лютым і ліпені.

* * *

— Табе добра, — наракае жонка мужу.

— Чаму?

— Бо ты маеш мяне, а я такая адзінокая.

Вясна прыйшла



Фота УЛАДЗІСЛАВА ЗАВАДСКАГА

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10
11	12	13	14	15	16	17	18	19	20
21	22	23	24	25	26	27	28	29	30

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — прыказку.

1. ручное прыстасаванне з пласцінак у выглядзе складнога паўкруга, якім абмахваюцца ў спякоту = 25 _ 24 _ 29 _ 11 _;

2. аўтаномная рэспубліка ў Расіі з Сыктыўкарам = 1 _ 10 _ 18 _ 17 _;

3. камп'ютэрны грызун = 22 _ 28 _ 30 _;

4. афіцыйны дыпламатычны зварот або ўмоўны графічны знак для запісу гукаў музыкі = 23 _ 16 _ 15 _ 13 _;

5. паныласць, сум = 12 _ 6 _ 5 _ 2 _;

6. дзяржава памежная з Аргенцінай = 9 _ 26 _ 3 _ 4 _;

7. завостраны стрыжань з дзяржальнікам, якога ў мяшку не схаваеш = 7 _ 19 _ 20 _ 21 _;

8. паглыбленне, упадзіна, дол = 14 _ 27 _ 8 _. **(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 11 нумара

Зман, каза, мора, пята, рой, снег, яма.

Рашэнне: **За камаром не ганяйся з тапаром.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Валянціне Марціновіч** з Краснага Сяла і **Анатолю Маўчуну** з Познані.

23.04 – 29.04

Баран (21.03. — 19.04.) Вялікая інтуіцыя ў інтарэсах. Справішся з найбольшымі выклікамі. Можаш рызыкнуць і заінвеставаць. Новыя карысныя знаёмствы.

Бык (20.04. — 20.05.) У маладзік Месяца можаш стартаваць з новымі праектамі. Добры ўплыў прыносячага шчасце і дабрабыт трыгона Юпітэра з Венерай.

Блізняты (21.05. — 21.06.) Тваё пачуццё гумару можа спатрэбіцца пры наладжванні кантактаў на працы. З 27.04. можа хтосьці злавіць цябе на недахопе ведаў на якуюсь тэму. Старайся нічога не даказваць, каб не асмяшыцца. Блізняты з першай дэкады схільныя да агрэсіўных, нерацыянальных паводзін.

Рак (22.06. — 22.07.) Квінкункс Марса з Хіронам пакажа твае глыбока скрываныя планы. У выніку будзеш прымушаны адмовіцца ад іх рэалізацыі. У час поўні Месяца можаш выбухнуць, што задзівіць тых, хто ўпэўнены ў тваім лагодным характары.

Леў (23.07. — 22.08.) Квадратура Сатурна з Сонцам (23-27.04.) можа папсаваць твае планы. Будзь цярплівы і не вызначай сабе мэт, якіх ты не ў змозе дасягнуць. Непахісная воля і ваяўнічая пастава. Маеш шанц добра падзарабіць.

Дзева (23.08. — 22.09.) Зайздрасць і лёгкадумнасць. Схільнасць да сварак з партнёрам і сябрамі. Не жыві ілюзіяй, што хтосьці, хто цябе не любіць, аддорыць пачуццямі. Адарвіся ад штодзённай мітусні.

Шалі (23.09. — 22.10.) Зайздрасць, сваркі і беспадстаўныя падазрэнні могуць моцна ўскладніць твае адносіны з людзьмі. Добры час заснаваць свой бізнес. Пільнуйся на пакупках, каб не было „лёгка прыйшло, лёгка пайшло".

Скарпіён (23.10. — 21.11.) Цяжка пазбегчы скандалу з партнёрам. Прычынай могуць быць менш ці больш абгрунтаваныя падазрэнні. Калі хтось з вас мае штосьці на сумленні, усё выйдзе на вочы. Добры час на падпісванне дамоў, кантрактаў. 27.04. шмат ласкі.

Стралец (22.11. — 21.12.) Задбай аб здароўе. Адзінокія Стральцы знойдуць аб'ект варты іх увагі. Змагайся за сваё, паслядоўна рэалізуй творчыя ідэі — неўзабаве паправяцца твае фінансы.

Казярог (22.12. — 19.01.) 23-27.04. ахопяць цябе апатыя ды благі настрой. Пастарайся, каб не набраліся гэтага ад цябе хатнія. 27.04. пачатак новай шматабяцаючай любові. На першае рандэву выберыся ў кіно, найлепш на рамантычную камедыю.

Вадалей (20.01. — 18.02.) Шчасця ў пары пільнуе планетоід Юно ў трыгоне з Юпітэрам. Справішся са штодзённымі абавязкамі, будзеш працавіты і сарганізаваны. 23-27.04. можаш канфліктавацца з шэфам або са старэйшым ад цябе мужчынам.

Рыбы (19.02. — 20.03.) Вялікая інтуіцыя і фантазія — падарунак сектылю Меркурыя і Нептуна. Кемлівасць, прадпрымальнасць. Знаёмыя мастакі вызваляць у табе творчую экспрэсію. Захочацца памяняць інтэр'ер дома ці стыль апранання.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960

Аляксандра Філіпік ☞ II

Ніва
велікодная


Ян Насута ☞ III

Каля поўдня прывялі Ісуса на Галгофу і распялі Яго там. Справа і злева ад Яго распялі двух разбойнікаў. Зласловіла Яму чэрнь, лаяў і адзін разбойнік. Ісус гаварыў: „Ойча! Даруй ім, бо не ведаюць, што робяць”...

Прыходжу прынесці праўду

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Зноў хвалюемся велікоднай радасцю ад перамогі ўвакрэслага Хрыста над смерцю. Пераможаны сатана і род чалавечы весяліцца. „Уваскрэс Хрыстос і ўпалі дэманы. Уваскрэс Хрыстос і весяляцца анёлы” — паведамляе Праваслаўная царква словамі Іаана Златавуста.

Хрыстос ведаў, што памрэ, каб стацца Збавіцелем чалавека, Любоўю мацнейшай за смерць. Меў Ён быць аддадзены ў рукі жорсткіх, бязлітасных людзей, вучаных, якія судзілі і ўладарылі, у рукі натоўпу і зброду. Меў быць сам, пакінуты вучнямі, прыяцелямі, тымі, якім дапамог, прынёс палёгку аздараўленнем цела і душы. Адзінока меў стаць насупраць свайго наканавання і чалавечай жорсткасці. Самотны — за нас усіх і нам усім. Ісус ціхмяна чакаў таго, пра што ведаў. Яшчэ ноччу, перад узыходам сонца, сказаў Пятру, Якаву і Іаану: „Ужо наблізіўся час і Сын Чалавечы прадаецца ў рукі грэшнікаў. Устаньце, пойдзем, вось наблізіўся той, хто прадасць Мяне” (Марк 14:41-42).

Ісус перад сінедрыёнам

Здраджанага сваім вучнем Іудам, Ісуса схапілі воіны і завялі да былога першасвяшчэнніка Анны. Ісус сказаў Анне: „Я заўсёды гаварыў яўна свету; Я заўсёды навучаў у сінагозе і ў храме, куды заўсёды сходзяцца іудзеі; Я не гаварыў нічога тайком. Чаго дапытваеце Мяне? Спытайце тых, што чулі, што Я ім гаварыў, яны ведаюць, што Я ім сказаў” (Іаан 18:20-21). Калі Ісус сказаў гэта, адзін са слуг першасвяшчэнніка ўдарыў Яго па твары. Пасля завялі Ісуса да актуальнага першасвяшчэнніка Каіафы, зяця Анны, у яўрэйскі суд сінедрыён. Там спыталі Яго: „Ці Ты Месія? Скажы нам”. Ён адказаў ім: „Гавару вам: З гэтай пары ўбачыце Сына Чалавечага, які сядзіць праваруч сілы Божай і ідзе на аблоках нябесных” (Матф. 26:63-64). І тлум, за першасвяшчэннікам, закрычаў, што Ісус заслугоўвае смерці за блюзнерства. Чэрнь плявала Яму ў аблічча і біла Яго. Гэтае дзеянне было парушэннем тагачаснага закону, бо здзекавацца над абвінавачаным дазвалялася толькі пасля вынясення прыгавору.

Ісус перад Пілатам

Рашэнне сінедрыёна не магло быць выканана без згоды рымскага пракуратара, таму ў пятніцу павялі Яго да правіцеля Іудзеі — Пілата. Пілат не дашукаўся ў Ісуса ніякай віны і хацеў, пасля цялеснага пакарання, Яго звольніць. Аднак тлум, падбухтораны сваімі рэлігійнымі лідэрамі, запатрабаваў Ягонай смерці. Перад Пілатам, які быў іншаверцам, чэрнь абвінавачвала Ісуса ў падбухторванні народу супраць рымскага панавання.

Было традыцыяй, што пад свята звальнялі аднаго вязня. І тлум запатрабаваў, каб звольніць не Ісуса, але Вараву, які ўчыніў у горадзе непаладкі і забіў чалавека. Пілат, не змогшы пераканаць узбуранай чэрні, уступіў ёй. Перад ёю памыў ён у вадзе свае рукі, сказаўшы: „Невінаваты я ў крыві Праведніка Гэтага; глядзіце вы”. А тлум яму адказаў: „Кроў Яго на нас і на дзецях нашых”. Тады Пілат вызваліў Вараву, а Ісуса, біўшы, аддаў на распяцце.

Распяцце Ісуса Хрыста

Распяцце не было ў яўрэйскай традыцыі, яно з’явілася ў іх з прыходам рымлян. Найвышэйшай традыцыйнай мерай пакарання ў яўрэяў было забіванне прысуджанага камянямі, якіх было багата ў Палесціне. Згодна рымскаму звычаю, перад распяццем можна было цялесна здзекавацца над асуджаным; пасля гэтага ўступнага пакарання пакутнік быў абавязаны несці свой крыж.

Воіны, якія вялі Ісуса з Пілатавай прэторыі на гару Галгофу, здзекаваліся над ім: білі Яго, аплёўвалі, з’едліва насмейваліся. Міма ішоў з поля Сіман Кірынеец і яны заставілі яго несці Ісусаў крыж. За Ісусам ішло многа народу і жанчыны, якія плакалі па Ім і галасілі. Ён, звярнуўшыся да іх, сказаў: „Дочкі іерусалімскія! Не плачце па Мне, але па сабе плачце і па дзецях вашых, бо настаюць дні, калі скажуць: „шчаслівыя няплодныя, і ўлонні не радзіўшыя, і саскі не карміўшыя”. Тады будуць гаварыць горам: „упадзіце на нас”, і ўзгоркам: „накрыйце нас”. Бо калі з зелянеючым дрэвам так робяць, то што будзе з сухім?” (Лука 23:28-31). І праз пару дзесяткаў гадоў тыя дні насталі, калі Цітавы легіёны жорстка расправіліся з Іерусалімам, і кроў, якой цяпер прагнулі жыхары горада, пралілася на іх патомкаў.

Каля поўдня прывялі Ісуса на Галгофу і распялі Яго там. Справа і злева ад Яго распялі двух разбойнікаў. Зласловіла Яму чэрнь, лаяў і адзін разбойнік. Ісус гаварыў: „Ойча! Даруй ім, бо не ведаюць, што робяць”. А другі разбойнік прасіў: „Успомні мяне, Госпадзе, калі прыйдзеш у Царства Тваё”. І адказаў яму Ісус: „Праўду кажу табе, што сёння са Мною будзеш у раі” (Лука 23:42-43).

Ад шостай гадзіны цемра была па ўсёй зямлі да гадзіны дзевятай. Каля дзевятай Ісус загаласіў моцным голасам: „Ойча! У рукі Твае аддаю дух Мой”; сказаўшы гэта, Ён выпусціў дух. Тады завеса, што была ў храме, разадралася папалам, і зямля здрыганулася, і камяні раскалоліся, і магілы расчыніліся. Сотнік і ўсе тыя, што з ім вартавалі Ісуса, бачачы тое што адбывалася, перапалохаліся вельмі і казалі: „Сапраўды Ён быў Сын Божы”. І ўвесь народ, што сышоўся на гэтае відовішча, бачачы, што адбылося, вяртаўся, б’ючы сябе ў грудзі.

* * *

У час праваслаўнага вячэрняга набажэнства ў Вялікую пятніцу прыгадваем зняцце Хрыста з крыжа. Дзеля гэтага на сярэдзіну царквы выносіцца плашчаніцу — саван з выявай Ісусавага цела. У Вялікую суботу абносім вакол царквы плашчаніцу ў памяць пахавання Ісуса ў магіле.

У Праваслаўнай царкве радасны дзень Уваскрэсення завяршае вячэрняе набажэнства, калі чытаюцца словы апостала Фамы: „Калі не пабачу на руках Яго ран ад цвікоў, і не пакладу пальца майго ў раны ад цвікоў, і не пакладу рукі маёй у рэбры Яго, не паверу”. Апостал Фама не хацеў без праверкі паверыць, бо ўваскрэсенне Ісуса было зусім новым адчуваннем знешніх пачуццяў у тым сэнсе, што бачылі Яго, елі з Ім, размаўлялі, запамяталі Яго навуку. Недаступны чалавечаму пазнанню характар уваскрэсення не паддаваўся апісанню, якога ў Евангеллі і няма.

Міхал Мінцэвіч

— Цяжкае было ў мяне дзяцінства. Калі мне было 3 гады, памерла мая маці. Хаця было ў яе шасцёра дзетак, толькі я адна асталася ў жывых. Трох маіх брацікаў памерлі, калі ім яшчэ не было нават годзіка, а мае сястрычкі паўміралі ў восем гадоў, — пачынае з сумных падзей свой расказ спадарыня Аляксандра, якая выводзіцца з навасадскай сям'і Віктара і Кіліны Марозаў. Яе бацька памёр пасля няўдалага выезду ў бежанства...

Віншуем Вас са 100-годдзем

Аляксандра Філіпік з Гайнаўкі на Вялікдзень (23 красавіка) будзе адзначаць стагоддзе з дня нараджэння. На другі дзень свята запланаваная вялікая сямейная сустрэча. Яшчэ жыве 5 дзяцей юбіляркі, 16 унукаў, 20 праўнукаў і 20 прапраўнукаў. Дзяцінства і маладосцьа бабуля Аляксандра правял ў Навасадах і Трывежы. Замуж выйшла ў Вежанку і там пражыла найбольш гадоў. Зараз жыве ў сына Мікалая і нявесткі Марыі ў Гайнаўцы і расказвае пра падзеі дарэвалюцыйнага і ваенных перыядаў.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Аляксандра Філіпік

Аляксандру Філіпік я спатыкаю на лавачцы ля вялікага шыкарнага дома. Бабуля выйшла адпачыць на свежым паветры і пацешыцца сонечным днём. Яшчэ ў пачатку размовы заяўляе, што да яе трэба гаварыць голасна і на размову запрашае ў хату. Ідучы на гутарку, захапляюся жвавасцю бабулькі, якая хуткім крокам уваходзіць у дом, а пасля без вялікіх цяжкасцей падымаецца па высокай лесвіцы на першы паверх. Пасля аказваецца, што жыццёвыя выпрабаванні не спіхнулі маёй субяседніцы ў безнадзейнасць, але дадалі ёй сіл змагацца з чарговымі складанасцямі. Засталася ёй добрая памяць. Бабуля Аляксандра памятае даты і падзеі з далёкага мінулага.

Цяжкія дзяцінства і маладосць

— Цяжкае было ў мяне дзяцінства. Калі мне было 3 гады, памерла мая маці. Хаця было ў яе шасцёра дзетак, толькі я адна асталася ў жывых. Трох маіх брацікаў памерлі, калі ім яшчэ не было нават годзіка, а мае сястрычкі паўміралі ў восем гадоў, — пачынае з сумных падзей свой расказ спадарыня Аляксандра, якая выводзіцца з навасадскай сям'і Віктара і Кіліны Марозаў. Яе бацька памёр пасля няўдалага выезду ў бежанства.

— Мой бацька быў добрым гаспадаром, займаўся таксама сталярствам. У бежанства адпраўляліся мы на брычцы і з двума коньмі. Аднак не паспелі мы пераправіцца праз мост у Нараўцы, які згарэў. Праседзелі мы побач Нараўкі два тыдні і вярнуліся дамоў. Усю сваю маёмасць схавалі нанач у клуню, а раніцай аказалася, што ўсё нам укралі, разам з брычкай. Бацька не перанёс такой патраты і ў гэты самы дзень памёр ад інфаркту, — кажа бабуля Аляксандра. — Яшчэ тры гады гадавала мяне старэйшая жанчына, якую бацька наняў для апекі над дзяцьмі. Пазычала яна нашых коней да працы ў полі і за гэта людзі з Навасадаў абраблялі нашу зямлю. Прыходзілася мне тады пасвіць коней, якіх я не магла стрымаць. Коні беглі ў збожжа, а я не магла нічога зрабіць. Пасля памерла мая апякунка, узяла мяне да сябе цёця Анастасія з Трывежы і я дапамагала там у гаспадарскіх работах. Наша поле з Навасадаў адалі ў арэнду, а пасля прадалі дом, дзе мы жыАсабліва цяжка жылося Аляксандры Мароз у час I сусветнай вайны.

— Быў такі адзін год, калі ў нашай вёсцы вымерзла ўсё жыта. Немцы давалі на адну асобу па адным кілаграме мукі ў месяц. Тады мы рабілі хлеб з грэчкі, і са свяропкі таксама, — гаворыць мая старэнькая субяседніца.

Калі Аляксандры трэба было ісці ў школу, настала сусветная вайна. Пасля сямейных няшчасцяў яна не паступіла на вучобу.

— Я пражыла жыццё не ўмеючы чытаць і пісаць. Унучка навучыла мяне распісацца, каб магла я атрымліваць пенсію, — успамінае бабуля Аляксандра.

Ранняе замужжа

Аляксандра Мароз выйшла замуж у вельмі раннім узросце. А можа жыццёвыя абставіны прымусілі да такога выбару?

— Калі я выходзіла замуж, мне было чатырнаццаць з паловай года, а ў васемнаццаць гадоў я ўжо нарадзіла сына. У майго мужа Івана Філіпіка была сямігектарная гаспадарка з добрымі землямі. Гадавалі мы 3 коней, 3 каровы, малодшае быдла. З майго мужа быў добры гаспадар. Пасля мой Іван пачаў выпіваць і тады стала цяжэй. У канцы сэрца падкачала, лекара не было і муж памёр, — кажа спадарыня Аляксандра, якая стала ўдавой у 56-гадовым узросце.

Аляксандры Філіпік, якая выгадавала шасцёра дзяцей, даводзілася многа працаваць.

— За работай прайшло маё жыццё. Я многа прала і ткала, бо трэба было падрыхтаваць сваё палатно, — гаворыць бабулька.

Народная медыцына

Аляксандра Філіпік кажа, што ў сваім жыцці толькі некалькі разоў наведвала лекараў і найахвотней карыстаецца народнай медыцынай.

— Пасля ваенных дзеянняў 1939 года прабіла я вока сцяблом з жытняй саломы. Гайнаўскі лекар выняў з вока смецце, але яно апухла. Беластоцкі доктар сказаў, што вока трэба выняць, каб інфекцыя не перайшла на другое вока. З адным вокам пражыла я большую частку жыцця нарадзіла яшчэ і выгадавала наймалодшага сына, — кажа юбілярка.

Яшчэ і зараз бабуля Аляксандра прымае таблеткі толькі ў выпадку вялікай неабходнасці, калі настойваюць сын Мікалай і нявестка Марыя. Жывучы ў Гайнаўцы, бабуля двойчы наведала доктара, у час вялікай прастуды і калі балела вуха.

— Я сама сабе лекар. Калі трэба, я рамонак п'ю, а ў выпадку кашлю бальзам свойскай работы прымяняю. Зараз сынавая ўсё цёплае мне прыносіць, то я і не прастываю, — гаворыць бабулька.

Жыве з малітвай і постам

Аляксандра Філіпік у час посту не есць малочных прадуктаў і іншага няпоснага харчавання, а ў пятніцу і суботу перад Вялікаднем увогуле не прымае ніякіх напіткаў і прадуктаў.

— Ужо амаль 44 гады я не ем мяса і не п'ю малака па серадах і пятніцах. У час посту замест малака я п'ю кампот, — кажа бабулька, якая стала сурова пасціць пасля смерці мужа. — Тэлевізар і радыё мяне не цікавяць. Многа ў мяне сямейнікаў і яны мяне наведваюць.

Жыццёвы рэцэпт бабулі Аляксандры — спакойна прымаць усе складанасці і выпрабаванні.

— Я дзякую Богу за ўсё, што сустрэла ў сваім жыцці і прашу ў малітвах, каб спакойна дажыць у дзяцей. Сынок мой добры і нявестка залатая, — хваліць бабуля дзяцей, якія апякуюцца ёю. — Лаяцца я не ўмела і дрэнных слоў не гаварыла і ўсё жыццё старалася пражыць з Богам.

Аляксандра Філіпік успамінае, што быў у яе моцны голас, але перад усім спявала яна духоўныя песні.

— Раней я і не падумала, што буду так доўга жыць, але ўсё залежыць ад Бога, — гаворыць спадарыня Аляксандра. — Усё ў нас будзе, калі будзем трымацца дзесяці Божых запаветаў. Нельга рабіць нічога дрэннага. Трэба маліцца. Малітвам навучыў мяне мой бацька, які быў старастам у дубінскай царкве.

Бабуля Аляксандра кажа, што наведвала царкву ў Курашаве пастаянна ў нядзелі і ў час усіх іншых святаў, малілася таксама дома.

Аляксей МАРОЗ

Віншуем Вас, бабуля Аляксандра, з юбілеем. Жадаем у радасці і спакоі праводзіць час са сваёй сям'ёй і атрымаць тое, чаго Вы просіце ў малітвах.

Калі напалі немцы, то стралялі з самалётаў так, аж лісце на дрэвах траслося. А рускія басанож уцякалі, усё пакідалі. Пасля мясцовыя людзі хадзілі туды, дзе стаяла іхняя часць, і забіралі абутак, бялізну...

Жыць у Лысых

Да вайны — успамінае Ян НАСУТА з Лысых Вышкаўскай гміны, народжаны ў 1934 годзе, — мой бацька на чыгунцы ў Страблі працаваў, чорнарабочым. І крыху зямлі было, то бацька зімою нават па начах малаціў; мама вяла дом. Было нас чацвёра дзяцей, апрача мяне дзве старэйшыя сястры і адна малодшая. І амаль усе нашы суседзі малазямельныя былі, мо толькі ў траіх было па больш чым дзесяць гектараў. У багацейшых было па пары коней, а бяднейшыя па адным мелі і спрагаліся для цяжэйшых работ. Часам ездзілі ў царкву ў Райск, а найчасцей то жанчыны ў Кажаны хадзілі праз мост басанож, а зімою па лёдзе.

Людзі лавілі рыбу ў Нарве і жыдам прадавалі. Мама казала, што тут, дзе сёння трактары з касілкамі ездзяць, была вялікая глыба, і рыбы тады многа было. Лавілі невадамі; кломлямі і броднямі не лавілі. Невада было з 8-10 метраў, зверху меў прычэпленыя паплаўкі, а знізу падвешаныя кавалкі жалеза, каб не закрунуўся. Цягнулі яго з двух бакоў, тычкамі выпалохвалі рыбу з карчоў і выцягалі. Мой тата рыбы не лавіў, бо не меў на гэта часу. Крыху часу меў дзед і ў вольныя хвіліны лавіў. Трымалі рыбу ў скрыні памерам метр на два, якую апускалі ў ваду і накрывалі накрыўкай. Жыдам або вазілі, або яны самі прыязджалі са станцыі, дзе мелі крамы.

Жыды на станцыі мелі таксама тартак і млын ды фабрыку цвікоў. Тартак і млын прыводзіліся ў рух паравымі рухавікамі. Драўніну ў тартак сплаўлялі з Белавежы. Ад ракі выкапалі пад тартак канаву, у якую заганялі плыты, а адтуль бярвенні коньмі выцягалі. У вайну, як прыйшоў немец, жыды са Страблі паўцякалі і ўсё пакінулі.

Наша вёска мела свой лес. Чыста тады ў ім было, усё было выграблена да голечкі, а сёння там не прайсці. Дроў людзі патрабавалі нямнога, бо хаты невялікія былі, а да таго ж на зіму абкладвалі іх шыпкамі.

Як прыйшлі саветы, то ў Страблі стала іх ваенная часць; занялі яны панскі палац і чваракі; пан у Страблі не жыў, жыў ён у Варшаве, а калі летам прыязджаў у Страблю, то так напіваўся, што загадваў запрагаць коней у сані і вазіць яго па пяску. І ў нас, у нашай новай хаце, закватаравалася двух лейтэнантаў: Шабалдзін і Кодзін; яны разам займалі адзін пакой, у нас яны толькі начавалі. Адзін з іх быў жанаты, але жонкі тут не было. Другі быў кавалерам і адной мясцовай дзяўчыне дзіця прыстроіў.

Калі напалі немцы, то стралялі з самалётаў так, аж лісце на дрэвах траслося. А рускія басанож уцякалі, усё пакідалі. Пасля мясцовыя людзі хадзілі туды, дзе стаяла іхняя часць, і забіралі абутак, бялізну.

Бацьку звольнілі з працы на чыгунцы. А да нас зноў пасяліўся кватарант, нямецкі вахцёр, але жыў у нас толькі паўгода; мы баяліся да яго адзывацца. Пасля нямецкія камандзіры на плябаніі жылі, а радавыя вахцёры мелі каля моста *ваху* і там вартавалі. У нашай вёсцы была „фабрычка" самагонкі, тыя вахцёры часта напіваліся; асцерагалі яны нас перад эсэсаўцамі, што стаялі ў Вышках. Па-за мостам чыгунку пільнавалі людзі з навакольных вёсак; побач пуцей былі белыя слупкі і пры кожным стаяў мясцовы чалавек, каб партызаны не парвалі рэек. Але тут было спакойна і эшалоны ішлі на фронт бесперапынна.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Ян Насута

Саветы нікога з нашай вёскі не вывезлі, і немцы таксама. Немцы задумалі вывазку, мая сястра і сваякі былі вызначаны, але паўцякалі ў іншыя вёскі і так удалося.

Калі ад усходу наступаў фронт, то немцы падмінавалі вадакачку на станцыі і жалезны чыгуначны мост. Рускія не бамбілі моста, толькі некалькі бомб каля яго скінулі. І як яны з'явіліся ў Чараўках, тады немцы мост і вадакачку ўзарвалі; усё разыгралася за адну ноч. А мы на той час паўцякалі ў лес, у зямлянкі. Сваяк наш з зямлянкі выглянуў, то яго савецкі снайпер параніў. Але вёска наша ўцалела.

У нашай хаце пасяліўся чарговы кватарант, савецкі маёр, які працаваў пры адбудове чыгуначнага моста. Ставілі драўляны мост побач заваленага жалезнага, высеклі дзеля гэтага каля дзесяці гектараў панскага лесу. Мост ставілі дзень і ноч, за тыдзень яго збудавалі. А людзей з навакольных вёсак пазганялі з лапатамі, каб перасыпаць насып ад моста жалезнага да драўлянага. Той драўляны мост стаяў яшчэ каля дзесяці гадоў пасля вайны, пакуль фірма са Старасельцаў не паставіла новага жалезнага. А драўніну ад старога моста кудысь забралі.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Чыгуначны мост каля Лысых

Пасля вызвалення хадзілі банды. Тата, які быў крыху партыйны, хадзіў у стары дом і хаваўся там у выямцы за печкай. Але з ім працаваў паляк, які супакойваў яго:

— Перш чым да цябе, да мяне прыйдуць.

Але не прыйшлі. У аднаго праваслаўнага былі тры дачкі, якія залюбіліся з трыма каталіцкімі хлопцамі. Той бацька не згаджаўся аддаць іх замуж за любоўнікаў і банда таго бацьку забіла. Дзяўчаты павыходзілі замуж, адна пара недзе выехала, а дзве пары асталіся жыць на станцыі. То тыя два хлопцы нават нейкі час былі ў турме сядзелі; яны ўжо паўміралі, а іх жонкі цяпер найбольшымі тут каталічкамі.

Зараз пасля вызвалення запусцілі ў ход тартак і млын. Тартак працаваў да часу, аж пакуль там работнік у прывадны пас не папаўся. Тады тартак закрылі, а на яго месцы запусцілі бетонны завод. У тартаку тата працаваў, а ў бетонны завод стаў на працу я, працаваў у складзе цэменту. Выраблялі там бардзюры, брусчатку, цяжкія пліты — усё гэта ішло ў Польшчу, найбольш у Бельск. Пасля закрыцця бетоннага завода на яго месцы стаў склад аўтазапчастак.

А рэчка Нарва замульвалася, штогод падмывала берагі. Каля Лысых быў рукаў, у якім шчупакі вадзіліся, а цяпер усё высахла, асабліва рэчка стала гібець пасля таго, як Семяноўскае вадасховішча зрабілі. Калісь каля нашай вёскі было каля дваццаці байдарак на пракат, але рэчка адступіла, а байдаркі расплыліся невядома куды. Было наязджала да нас столькі людзей, што не было дзе сесці, а цяпер усё ў Дакторцах.

Часам тапіліся людзі. Школьнікі былі над рэчкай і адно дзіця ўтапілася. І пры мне адзін хлопец утапіўся. Я прыйшоў на рэчку ў абедзенны перапынак. Той хлопец ішоў па плыткім месцы і не ведаў, што зараз за ім глыб і ўваліўся ў яе. Я кінуўся ратаваць, ухапіў яго, але выцягнуць не даў рады з-за парыўнога цячэння; ледзь сам выратаваўся. І тапельцаў часам выцягалі, што вада да нас прыносіла.

Рыбу цяпер мала хто ловіць, мо толькі крыху браканьераў зімою з палонак ловіць, а летам сеткамі. Але што тут за рыба, калі вады да кален.

Калісь чарот ад рэчкі бралі часам на стрэхі заміж саломы. А цяпер на Нарве амаль ніхто нічога не косіць, часам толькі хто ад шляхты прыедзе. Калісь дзе толькі травінка была, то яе касілі, а цяпер амаль усё стаіць. У нашай вёсцы было калісь сто кароў, а цяпер толькі чатыры асталося. Наймалодшаму нашаму жыхару, кавалеру, трыццаць пяць, чарговаму — пяцьдзесят, а рэшта — старыя.

Ад станцыі, па дарозе ў райскую царкву, стаіць праваслаўны помнік з крыжам. Ці крыж на ім наадварот прычэплены? Бацюшка маліўся і нічога не гаварыў. А ад Страблі, ад касцёла, стаіць каталіцкі крыж, бо ў нашай вёсцы па палове адных і другіх. Паставіў яго ў 1929 годзе мясцовы жыхар Аляксандр Матэвушук, які быў зарабіў у Амерыцы грошы і такую зрабіў ахвяру.

Запісаў Аляксандр Вярбіцкі

Запіс злачынства

— Дык чаму вы ў Польшчы размаўляеце па-беларуску з жонкай ды дачкой? — здзівілася бельская судовая куратар, па-прафесіі дыпламаваны земляроб.

Куратар ведала аб тым з запісаных касетак дыктафона, але, мабыць, не пацікавілася ні запісамі, ні іншымі дакументамі, дзе напісана, што кавалер Анатоль Барадач з мястэчка К. і ўдава — Вера Салтысік з вёскі Г. — не сужонства, а адзінае ў іх супольнае гэта цяпер васьмігадовая дачушка Святланка. Абодвум ім за сорак. Анатоль Барадач, які займаецца раз'язным гандлем, сапраўды барадач — змахвае на першы погляд на настаўніка ці агулам пісьменнага чалавека, што, дарэчы, відаць па ягоных судовых пісьмах. А чаму пайшоў ён у суды і іншыя ўстановы?

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Пазнаёміліся, калі Анатоль здаў быў свой самаход на рамонт у майстэрню да швагра. Вера працавала ў краме. Спадабаліся адно аднаму. У Веры двое дзяцей ад першага мужа — старэйшае ўжо замужам. Калі б не спадабаліся, вядома, нічога не было б. Вяртаюся да гэтага пытання — да таго, што быў час, калі абое, Толік і Вера, былі задаволеныя сустрэчай, мабыць, нават шчаслівыя, што яшчэ раз спрабавалі скласці сабе нанава жыццё. Гэтае пытанне стаўлю, перабіваючы паток інфармацыі пра суды, паліцыю, куратараў, установы дзеля ратавання сям'і. Перада мною таўшчэрная кіпа ксеракопій дакументаў. Чаго судзіцца, от старыя ды дурныя — так мне нельга і азывацца як пастаронняму чалавеку, дарэчы, узросту маіх герояў. Трэба ж пагадзіцца. Тут жа ж дзіцяці шкада. А як жа ўсё пачалося?

Анатоль Барадач, пажыўшы пяць гадоў разам, стаў даязным бацькам. Заняты зарабляннем грошай чым мог, ганяўся па дарогах Беласточчыны з таварам „хадлівым" па вёсках — нават са свежым хлебам і малаком. Ягонае адзінае дзіцятка гадавалася добра. Бацькі ў гадах — яны ўжо іначай разбіраюцца ў выхоўванні малых. Анатоль быў таксама рады, што знайшоў жанчыну, якой таксама быў даспадобы. Ды раптам, прыехаўшы дадому ў Г., застаў дзверы зачыненыя. Быццам бы ўсе кудысьці выехалі ў гасціну. А ён якраз страціў працу і вадзіцельскія правы. Вера рашыла не ўпусціць свайго канкубента дахаты. Анатоль, гатовы зразумець, што ён ужо для Веры стаў няважным, аднак падаў яе ў суд за тое, што не дазваляе на кантакт з дзіцём. Сцвердзіў, што ейныя метады невыхаваўчыя, паколькі настаўляе дзіця супраць яго, маюць на малую благі псіхалагічны ўплыў, і найлепш было б адняць у яе дзіця ды аддаць на выхаванне бацьку. Не браў адваката, сам неяк складваў усе пісьмёны, у якіх не вельмі разбярэцца сам адзін чалавек з вёскі. Вера наняла адваката. Адвакат сказаў жанчыне, што і так вырашае ўсё ў карысць жанчын, а біцца трэба да канца, нават не заўжды чыстымі метадамі. Найлепшы метад, які паспяхова выкарыстоўваюць жанчыны ў Польшчы — спрабаваць даказаць распусту бацькі і сексуальнае настойванне ў адносінах да дзіцяці — нават калі нічога не дакажаш, спляжыш чалавеку імідж. Суд пасля допытаў і кансультацый не апраўдаў такога тыпу абвінавачанняў. Вырашыў пакінуць дзіця пры маці і даць магчымасць сустрэч бацьку з дачкой у першую і трэцюю суботу месяца, па тры гадзіны. Анатоль, усё ж, так як і раней стараўся як найчасцей бачыць дачушку. Заходзіў нават у школу, цікавіўся вынікамі, хоць, як у наступным абвінавачанні Вера адзначыла: „гэта кепска ўплывае на псіхіку дачкі, паколькі, як яна кажа, «гэтак не робяць іншыя бацькі»" (на школьныя сустрэчы прыходзяць толькі маці ды на выклік настаўніка). Анатоль Барадач стаў запісваць на дыктафоне свае сустрэчы з дачкой. У час сустрэчы Вера С. пазваніла на інтэрвенцыю ў паліцыю.

Запіс стэнаграмы з інтэрвенцыі функцыянераў паліцыі 3 мая 2003 г.

Паліцыянт І: *Дзень добры*. Анатоль Б.: *Добры дзень*. П. І: *Што тут дзеецца?!* Анатоль Б.: *Нічога не дзеецца, гуляем*. Вера С.: *Гуляем дык гуляем, але ёсць тут такая прылада, якая...* Паліцыянт І: *А тут што за запісванне, у чым тут справа?* Вера С.: *Справа ў тым, што тут запісваюць, а мы не маем жадання*. Тут распытванні ў Анатоля Барадача пра асабістыя інфармацыі. Паліцыянт І: *Чаго пані ад нас трэба, вы заяўлялі?..* Вера С.: *Пане ўлада, я патрабую аховы, патрабую забеспячэння...* Паліцыянт І: *У гэты момант вы запісваеце?* Анатоль Б.: *Так, запісваю, каб вы не мелі, каб не мелі...* Вера С.: *Так...* Паліцыянт: *Вы не жадаеце, каб гэты пан запісваў*. Вера С.: *Абсалютна не жадаю сабе*. Паліцыянт: *Я напішу аб гэтым нататку*. Анатоль Б.: *Пішы пан, я вельмі прасіў бы, каб гэта быў дэталёвы рапарт, і трапіў ён у суд. Напішы пан, што ў гэты момант была спынена мая гульня з дзіцём, суд будзе ведаць гэта таксама з майго запісу, гэта будзе доказ, што гэты інцыдэнт быў справакаваны паняй Верай*. Вера С.: *Які інцыдэнт, што, можа гэта, што маці дзіцяці звяртае ўвагу на тое, што дзіця не хоча каб запісвалі. (...)* Паліцянт: *Дзе мелі адбывацца візіты?* Вера С.: *Тут, так*. Анатоль Б.: *Таму што маці не пагаджаецца на тое, каб я з малой бачыўся па-за домам*. Вера С.: *Дзіця замалое, каб яго забіраць, тым больш, што Святланка не хоча. Святланка, скажы, хочаш, ці не хочаш?..* Святланка Б.: *Не хачу...* Вера С.: *Ехаць з татам у Кленікі?* Паліцыянт І: *На такім канфлікце найгорш выходзяць дзеці*. Анатоль Б.: *Вядома, што найгорш выходзяць дзеці.(...)* Вера С.: *Пане ўлада, гэта проста не было знуткавання над дзіцём, біццё, пінкі, такое было насілле ў сям'і. І тут тата падаў у суд*. Анатоль Б.: *Святланка, ты памятаеш?* Святланка Б.: *Ыгы*. Анатоль Б.: *Так? Так? А што ты памятаеш?* Вера С.: *Проста тата заявіў у суд, каб дзіцё забраць, і не ўдалося яму дзіцяці забраць, і гэта выходзіць на тое, што цяпер*. Паліцыянт І: *У гэты момант пытаюся ў пані, ці хочаце, каб мы гэтага пана вывелі за брамку па той прычыне, што запісвае? Тады просім вас апрануцца і разам з намі пакінуць гэты дом*. Анатоль Б.: *Я не выйду, я тут з дзіцём, і маю тут быць да 15.00*. Вера С: *Я не хачу, бо дзіця перажывае, дзіця нервуецца. Ужо маем досыць! (...)* Паліцыянт І: *Пані не жадае, каб вы запісвалі, а пан не ў сябе дома*. Вера С.: *Гэта дзіця не жадае, дзіця*. Паліцыянт: *Пан мае права на візіт, маеце права на ўсё, я не ведаю, як вы тут жывяце, як там усё ў вас, гэта толькі загад дзяжурнага, кароткі, трапны і на тэму, прашу апрануцца і выйсці з намі ды пакінуць сядзібу, бо гэта пані не хоча, я тут нічога для вас зрабіць не магу, я вас не гадзіў, значыць, не разводзіў і гадзіць не буду*. (...) Вера С.: *Бо тата прыкрасці нам робіць, не, Святланка?* Святланка Б.: *Ыгы*. Канчаткова Паліцыянт II схапіў Анатоля Барадача за кашулю на спіне: *Бярыце свой цэлафанавы кулёк і выходзім*.

У камендатуры: Анатоль Б.: *Маю пытанне, на якой падставе вашы людзі прыехалі і забралі мяне з Г. ад дачкі?* Дзяжурны афіцэр: *Вельмі добра зрабілі. Шкада, што палкай не ўрэзалі!* Анатоль Б.: *Так?* Дзяжурны: *Маеце дазвол з суда на запіс? Прад'явіце*. Анатоль Б.: *А вы — што я не маю права на запіс*. Дзяжурны афіцэр: *Wypierdalaj stąd!!! Bo jak ci, k..wa, j..nę!*

Анатоль Барадач судзіцца цяпер і з Паліцыяй за неадпаведныя яе паводзіны. Прабаваў гадзіць яго з Верай Салтысік працаўнік установы дапамогі дзецям, моладзі і сям'і ў Беластоку, былі разам у Г. Вера падпісала нават тое пагадненне. Ейны адвакат, аднак, справіўся па-свойму: заявіў у суд, што тая згода была *najściem na wolność osobistą* ягонай кліенткі, подпіс дала пад гвалтам, застрашаная. І аж траслася ад нерваў. А Святланка толькі хмыкала: Ыгы...

Міра ЛУКША

Вада

„Якія мы нешчаслівыя людзі, — нядаўна сказала мне адна жанчына. — Забываем пра тое, што галоўнае ў нашым жыцці, шукаем філасофскіх мэтаў, нейкіх вышуканых, узнёслых сэнсаў жыцця. Забываем пра тое, што ў шчасця рознае аблічча, што мы — шчаслівыя людзі, у якіх ёсць агромная жамчужына — наша жыццё. І не варта траціць яго ўпустую, у барацьбе за новыя ідэі не памагаючы другім людзям, спадзяючыся толькі на сябе".

Адзін малады чалавек усё свае жыццё марыў аб здзяйсненні пешай паходкі праз пустыню. Калі меў магчымасць, рыхтаваў патрэбныя яму рэчы, практыкаваўся і абдумваў маршрут. Здавалася, ён падрыхтаваў усё і нічога не забыў.

Урэшце ён мог адправіцца ў дарогу. Некалькі першых дзён усё было добра, аднак пасля ён заблудзіў і не ведаў куды ісці далей. Хлапец цярпеў ад гарачага сонца, пясчанай пустыні і ад таго, што пачынала яму не ставаць вады. Апошнімі сіламі ён дабраўся да скрыжавання дарог, упаў і ледзь чутным голасам прасіў вады...

Прачнуўся, калі пачуў на дарозе гул самахода. Дарогай ехаў славуты доктар. Паглядзеў на хлопца і сказаў, што яго арганізм штодзённа патрабуе прынамсі два літры вады, таму што вада — аснова жыцця. Сказаўшы гэта паехаў, сабе далей.

Праязджаў дарогай вучоны. Затрымаўся, выйшаў з самахода, паглядзеў на хлопца, выясніў яму ўсе свойствы H_2O і спосаб у які спалучаюцца атамныя частачкі. Але вады яму не даў.

Праязджаў палітык, які таксама затрымаўся. Паглядзеўшы на хлопца, сказаў, што ён не з ягонай партыі. Расказаў гісторыю пра ўжо неактуальнае абліванне палітычных праціўнікаў вадой і паехаў сабе далей.

Дарогай ехаў святар, ён таксама затрымаўся і сказаў хлопцу кароткую пропаведзь. Паясніў, што яго прага вады правільная, але павінен прагнуць і больш высокіх ідэалаў. Вады не аставіў.

Усе прыязджалі і ад'язджалі.

У самым канцы ішоў бядняк. Сустрэўшы хлопца, ён працягнуў да яго руку і падаў бутэльку з вадой. У такі спосаб, бядняк і хлопец, памагаючы сабе ўзаемна.

Мы затрымоўваемся часта, хвалімся сваімі талентамі і магчымасцямі. Жаль, што не заўсёды бачым, як сапраўдная жамчужына жыцця ўцякае нам з рук.

Аня ПЯТРОЎСКАЯ